ПАКУПКІ Ў ІНТЭРНЭЦЕ. БЕЗ РЫЗЫКІ 4

КУДЫ ЕДУЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ МІГРАНТЫ?

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 САКАВІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 49 (28916)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Славянскі базар у Віцебску» павінен цалкам адпавядаць чаканням гасцей фестывалю. Многія замежныя госці па гэтым знакавым міжнародным фестывалі ацэньваюць узровень развіцця культуры ў нашай краіне. Увага пільная не толькі з боку творчых колаў Беларусі і суседніх краін, але і ўсёй сусветнай супольнасці, таму што з многіх кантынентаў традыцыйна прыязджаюць да нас гледачы і ўдзельнікі гэтага музычнага форуму».

КАРАТКА

• В'етнам плануе стварыць у Беларусі вытворчасць гарбаты і кавы.

• Мінскія чаргавікі змогуць пабудаваць кватэры ў Смалявічах па заяўным прынцыпе. Кошт квадратнага метра чакаецца ніжэйшы, чым у сталіцы.

• У школах Беларусі правядуць маштабную рэвізію спортінвентару і дакупяць неабходнае.

• Па ініцыятыве Беларускага таварыства абароны спажыўцоў у 2018 годзе кампенсавана Br500 тысяч урону.

• Месячнік па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі стартаваў у Гомельскай вобласці.

• У Турцыі адкрылася самая вялікая ў Еўропе бальніца. У бальнічным комплексе больш за 3,6 тысячы ложка-месцаў і 131 аперацыйная.

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём Канстытуцыі!

Роўна 25 гадоў таму быў прыняты Асноўны Закон нашай краіны, які адкрыў новую старонку ў шматвяковай гісторыі беларускага народа. Гэта знакавая падзея дала магчымасць рэалізаваць імкненне многіх пакаленняў беларусаў быць гаспадарамі на сваёй зямлі, жыць у свабодным, справядлівым і стабільным грамадстве.

Канстытуцыя заклала трывалыя асновы дзяржаўнага суверэнітэту і палітычнага ўпарадкавання Беларусі, устанавіла гарантыі сацыяльных правоў грамадзян, стварыла ўмовы для захавання і прымнажэння гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны нацыі.

Абапіраючыся на ідэі і прынцыпы Асноўнага Закона, краіна дынамічна развіваецца — абнаўляюцца гарады і вёскі, павышаецца дабрабыт людзей, расце яе аўтарытэт на міжнароднай арэне.

Перакананы, што наша моладзь, якая толькі ўступае ў жыццё, унясе свой важкі ўклад ва ўмацаванне незалежнай беларускай дзяржавы.

Шчыра жадаю ўсім міру, дабра, шчасця і новых здзяйсненняў на карысць роднай Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

МЫ, НАРОД БЕЛАРУСІ...

3 гэтых слоў пачынаецца Асноўны Закон нашай краіны, якому сёння спаўняецца 25 гадоў.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Камунальныя стасункі

ЖЫЛЛЁВЫЯ ЎМОВЫ НА НОВЫ ЛАД

Абараніць правы ўласнікаў, спажыўцоў паслуг і іх пастаўшчыкоў

Новае назначэнне чэкаў «Жыллё», магчымасць перавесці арэнднае жыллё ў сацыяльнае, упаўнаважаныя асобы для кіравання агульнай маёмасцю, дазвол на пахаванне на закрытых могілках і іншыя змены чакаюць беларусаў у новых рэдакцыях некаторых законаў краіны. Пра наваўвядзенні, якія дэпутаты мусяць разгледзець на вясновай сесіі, расказаў Юрый ДАРАГАКУПЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.

Чэкі на жыллё

Чарговая рэдакцыя Жыллёвага кодэкса, які прынялі восем гадоў таму, — гэта фактычна настольная кніга на 265 старонак. Вясной яго разгледзяць у другім чытанні і, пэўна, ён будзе прыняты, спадзяецца старшыня.

З новага дакумента, у прыватнасці, выдаляць норму, якая датычыцца прыватызацыі жылля. Паколькі з 1 ліпеня 2016 года такая магчымасць была спынена, то ў новым дакуменце не павінна быць раздзела адносна пытання, якое ўжо не існуе, лічыць Юрый Дарагакупец:

— Грамадзяне дагэтуль намагаюцца рэалізаваць чэкі «Жыллё», якія яны не маглі выкарыстаць у свой час. Мы вернемся да гэтага пытання, калі будзем разглядаць закон пра імянныя прыватызацыйныя чэкі. Камісія хоча прапанаваць пашырыць сферу дзеяння чэкаў «Жыллё», бо асабліва шмат просьбаў паступае ад састарэлых людзей, якія хочуць выкарыстаць свае чэкі на рэканструкцыю кватэры: правесці газ, адрамантаваць дах, замяніць вокны... Аднак гэтыя людзі не падпадаюць пад палажэнне, што дазваляе прызнаць іх асобамі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Тым не менш яны заслужылі нейкія прэферэнцыі ад дзяржавы. Магчыма, хоць бы некаторыя катэгорыі вызначаць.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Працягваецца падпіска на II квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 - 763X

Ёсць пытанне — павінен быць адказ

Звароты грамадзян, абяцанні ўлады, будучае Пасланне народу, электаральныя кампаніі, дзейнасць Беларусі ў Афрыцы — усе гэтыя тэмы абмяркоўваліся ў чацвер на сустрэчах у Прэзідэнта.

Ніякіх узрушэнняў, выбары — як свята

Учора беларускі лідар прыняў з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлю Качанаву.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што падчас апошніх мерапрыемстваў — «Вялікай размовы з Прэзідэнтам», пасяджэння Савета бяспекі, тэматычных нарад — абмяркоўваліся розныя тэмы і прымаліся рашэнні. Паводле яго слоў, вызначыліся па многіх пытаннях эканамічнага характару, разглядалі і інтэграцыйныя працэсы з Расіяй, ЕС, у ЕАЭС і АДКБ. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: усё, пра што гаварылася, што абмяркоўвалі публічна і непублічна, павінна быць рэалізавана.

Акцэнт Аляксандр Лукашэнка зрабіў на пытаннях ад людзей, якія паступілі напярэдадні «Вялікай размовы». Ён адзначыў, што на ўсе тры тысячы пытанняў павінны быць дадзены адказы.

«Мы не павінны паказаць людзям, што паслухалі іх і забыліся. Мы павінны паказаць, што рэагуем на іх запыты. Я разумею, што людзі розныя. Тое, што самі павінны рабіць, яны часам скідаюць на ўладу. Такіх менш. Але ўсё роўна трэба адрэагаваць, каб ведаць, чым жывуць людзі. А там, дзе трэба, далучацца», — сказаў беларускі лідар.

Таксама Прэзідэнт пацікавіўся ходам падрыхтоўкі будучага Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. На яго думку, гэта важная падзея вясны, трэба прапаноўваць варыянт, каб кіраўнік дзяржавы працаваў над ім, не адкладаючы.

Яшчэ Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму будучых электаральных кампаній. Ён падкрэсліў: два будучыя гады не павінны ўвесці краіну ў нейкія ўзрушэнні, а ўсе выбары павінны прайсці, як свята. Аднак важная падрыхтоўка, якой павінны займацца не толькі ЦВК, але і Адміністрацыя Прэзідэнта.

Па выніках даклада Наталля Качанава пагутарыла з журналістамі. Яна расказала, што на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні і даручэнні, якія знаходзяцца на кантролі ў Адміністрацыі Прэзідэнта, у тым ліку — звароты грамадзян, якія паступілі напярэдадні «Вялікай размовы». Кіраўнік Адміністрацыі адзначыла, што па меры выканання даручэнняў або рашэння нейкіх задач людзі будуць інфармаваныя праз СМІ.

Вядома, на сустрэчы казалі і пра актуальную тэму інфармацыйнай бяспекі. Наталля Качанава далажыла беларускаму лідару пра тую сістэму, якая сёння створана ў Адміністрацыі, і пра тую работу, якая праводзіцца па гэтай тэме.

Як праходзіць падрыхтоўка будучага Паслання? «Цяпер адпрацоўваецца гэты дакумент. Нам сёлета, з аднаго боку, проста адпрацоўваць, таму што ўсе акцэнты расстаўленыя Прэзідэнтам, праведзена вялікая колькасць рознага ўзроўню нарад па асноўных відах дзейнасці, прынятыя дырэктывы. Цяпер гэта ўсё трэба акумуляваць, і Пасланне павінна быць такім сцвярджальным. Усе задачы зразумелыя, і на сённяшні дзень трэба займацца іх рэалізацыяй», — паведаміла яна.

Што да падрыхтоўкі прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла, што ніякай надзвычайнай сітуацыі ў гэтым няма, і ў прынцыпе не трэба рабіць адрозненняў паміж электаральнымі гадамі і астатнімі, паколькі трэба заўсёды працаваць добра і выконваць абяцанні, бо людзей падманваць нельга.

Працуем на афрыканскім поўдні

Учора Аляксандр Лукашэнка таксама прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі Віктара Шэймана.

Адна з цэнтральных тэм сустрэчы — развіццё супрацоўніцтва Беларусі з краінамі Афрыкі. Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб дамоўленасці, паводле якой Віктар Шэйман павінен быў наведаць шэраг афрыканскіх краін, з якімі наша краіна супрацоўнічае ці завязвае адносіны, каб разумець, на якія дзяржавы на гэтым кантыненце можна абапірацца для выбудоўвання адносін на далёкай дузе. У сувязі з гэтым беларускі лідар пацікавіўся, з кім Беларусі трэба супрацоўнічаць.

У адказ кіраўнік спраў Прэзідэнта расказаў аб перспектыўных кірунках работы ў Афрыцы — гэта здабыча карысных выкапняў, будаўніцтва, энергетыка, сельскагаспадарчая галіна, транспарт і лагістыка, падрыхтоўка кадраў.

Калі казаць аб канкрэтных дзяржавах, то па названых кірунках Беларусь будзе працаваць на поўдні Афрыкі — з Зімбабвэ, Замбіяй і Мазамбікам.

Перспектыўнай для Беларусі з'яўляецца і паўднёва-ўсходняя частка кантынента.

Другая тэма нарады — дзейнасць Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, падпарадкаваных прадпрыемстваў і арганізацый. Беларускі лідар звярнуў увагу, што гэта велізарная структура з самымі рознымі кірункамі, таму калі ёсць праблемы, іх трэба абазначыць зараз і вырашыць на працягу года.

Аляксандр Лукашэнка зноў нагадаў, што наступныя два гады будуць іспытам для ўсёй вертыкалі ўлады.

На сустрэчы гаварылі і аб новых кірунках дзейнасці Кіраўніцтва справамі — прагучалі прапановы па развіцці вытворчасці лекаў, медыцынскай тэхнікі і расходных матэрыялаў, а таксама закранулі тэму сельскай гаспадаркі, у прыватнасці стварэння прадпрыемства па вырошчванні і перапрацоўцы чырвонай рыбы.

Паводле БелТА.

Чвэрць стагоддзя суверэннай прававой дзяржаўнасці

25 гадоў таму 15 сакавіка 1994 года адбылася гістарычная падзея для беларускага народа і яго дзяржавы. Яна адкрыла новую эпоху ў іх развіцці, стала сімвалам якаснага змянення беларускай дзяржаўнасці. У гэты дзень была прынятая новая Канстытуцыя — Асноўны Закон нашай дзяржавы. Як вядома, значэнне Канстытуцыі ў любой дзяржаве такое вялікае, што сам факт яе прыняцця ацэньваецца як крок да дэмакратыі, да палітычнай і сацыяльнай стабільнасці.

Дваццаць пяць гадоў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — тэрмін для гісторыі параўнальна невялікі. Будучы ўпершыню ў гісторыі Беларусі прынятай шляхам свабоднага дэмакратычнага волевыяўлення, Канстытуцыя адлюстравала маральны, палітычны ўзровень грамадства, яго асноўныя ідэі канца XX стагоддзя, увасобіла ў сабе сацыяльныя ідэалы беларускага народа.

Канстытуцыя як прадукт пэўнай ступені развіцця грамадства з'явілася найвышэйшым дасягненнем палітычнай і прававой культуры беларускага народа. Разам з тым яна ўзнікла не на пустым месцы. Канстытуцыя ўвабрала ў сябе папярэднюю традыцыю беларускага канстытуцыяналізму, вопыт канстытуцыйнага будаўніцтва ў СССР, краінах Заходняй Еўропы, высновы навукі канстытуцыйнага права.

Канстытуцыя як найважнейшы палітыка-прававы дакумент, найвышэйшы акт народаўладдзя юрыдычна аформіла якасна новую сістэму дзяржаўнасці, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены, якія адбыліся ў дзяржаве і грамадстве. На думку Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, Канстытуцыя «служыць надзейным арыенцірам дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на стварэнне эфектыўнай эканомікі, забеспячэнне сацыяльнай абароны і дабрабыту насельніцтва, беражлівыя адносіны да традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа». Яна адпавядае патрабаванням часу, патрэбам палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця.

Замацаваныя ў Канстытуцыі прынцыпы і нормы гарантуюць стабільнасць канстытуцыйнага ладу і прававой сістэмы, закліканай ствараць умовы для існавання і належнага функцыянавання сацыяльных інстытутаў, забяспечваць правапарадак у грамадстве, цывілізаваныя адносіны паміж яго членамі. Адлюстроўваючы прынцыпы і палажэнні Канстытуцыі, прававая сістэма выступае ў якасці адной з найважнейшых і эфектыўных сістэм сацыяльнай інтэграцыі і сацыяльнага кіраўніцтва грамадскімі працэсамі і рознымі відамі дзейнасці.

Найважнейшай арганічнай часткай прававой сістэмы, яе ядром з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Валодаючы найвышэйшай юрыдычнай сілай, яна займае галоўнае становішча ва ўсёй прававой сістэме, аказвае канстытуцыйнае ўздзеянне на ўсе яе элементы, з'яўляецца магутным праваўтваральным фактарам у працэсе прамога дзеяння яе нормаў, а таксама выступае ў якасці нарматыўнага і цэнаснага арыенціра ўсяго нарматворчага працэсу.

Нормы Канстытуцыі дзейнічаюць прама, непасрэдна, з'яўляюцца першаснымі, зыходнымі, асноватворнымі для ўсіх галін права, валодаюць вяршэнствам, найбольшай стабільнасцю, забяспечваючы ўстойлівасць палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця. Канстытуцыя ўяўляе сабой адзіную прававую гарантыю забеспячэння стабільнасці прававой сістэмы, вызначае прынцыпы і межы яе развіцця.

Канстытуцыя складае фундамент усёй сістэмы заканадаўства, адыгрывае вызначальную ролю ў яе развіцці, прадугледжвае механізм прымянення нарматыўных прававых актаў у адпаведнасці з прынцыпам вяршэнства права (артыкул 7). Канстытуцыйная формула, якая прадпісвае выданне законаў, дэкрэтаў, указаў і іншых актаў дзяржаўных органаў на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй (артыкул 137), усталёўвае жорсткую меру звязанасці паміж канстытуцыйнымі нормамі і палажэннямі прававых актаў, выступае няўхільным, найважнейшым патрабаваннем канстытуцыйнасці нарматворчай дзейнасці.

Канстытуцыя Беларусі замацавала якасна новы этап народаўладдзя, яго каштоўнасці, а таксама рэальную ўладу народа, пра якую стагоддзямі марылі вядомыя беларускія асветнікі і паэты. Народ як крыніца дзяржаўнай улады і носьбіт суверэнітэту ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй.

Артыкул 1 Канстытуцыі змяшчае мадэль развіцця Рэспублікі Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Максімальнае прыбліжэнне да гэтай мадэлі, да «дасканалага» грамадства магчыма толькі праз выкананне ўсімі Канстытуцыі, фарміраванне правапрымяняльнай практыкі, якая адпавядае яе сутнасці, забеспячэнне правоў і свабод грамадзян, добрасумленнае, адказнае выкананне апошнімі сваіх канстытуцыйных абавязкаў. У гэтай справе вельмі важная роля канстытуцыйнага кантролю, што ажыццяўляецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь, які такім чынам садзейнічае ўдасканаленню нацыянальнай прававой сістэмы, фарміраванню дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы і ў першую чаргу абароне правоў, свабод і законных інтарэсаў чалавека і грамадзяніна. Канстытуцыйны Суд у адным са штогадовых пасланняў аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь адзначыў, што дэмакратыя і вяршэнства права — дзве ўзаемаабумоўленыя і ўзаемазвязаныя канстытуцыйныя каштоўнасці. З дэмакратыяй, заснаванай на Канстытуцыі, звязана рэалізацыя такіх канстытуцыйных каштоўнасцяў, як законнасць, роўнасць, справядлівасць, правы і свабоды чалавека.

Як вядома, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 года № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд, нароўні з іншымі паўнамоцтвамі, надзелены паўнамоцтвам ажыццяўляць абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і адобраных Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, да падпісання іх Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пры ацэнцы канстытуцыйнасці нормаў законаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд зыходзіць з прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі, выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу нормаў, якія правяраюцца, з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, што знаходзіць выражэнне ў яго прававых пазіцыях.

У 2008—2018 гадах у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйным Судом ажыццёўлена праверка канстытуцыйнасці 897 законаў, уключаючы восем кодэксаў.

За ўвесь перыяд сваёй дзейнасці Канстытуцыйным Судом прынята звыш 1350 рашэнняў, у тым ліку ўнесена ў дзяржаўныя нарматворчыя органы больш за 210 прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства.

Наша Канстытуцыя змяшчае велізарны патэнцыял для фарміравання сапраўды народнай суверэннай дэмакратычнай прававой дзяржавы з канстытуцыйнай эканомікай, развіцця чалавека, усіх сфер жыццядзейнасці.

Надзеі і чаканні, спароджаныя Канстытуцыяй у нашай свядомасці, не заўсёды могуць рэалізавацца адразу і ў поўнай меры. Нягледзячы на гэта, усе мы адзіныя ў тым, што: Дзень Канстытуцыі — гэта па сутнасці Дзень Дэмакратыі, а роўна і Дзень суверэннай прававой дзяржаўнасці.

Анатоль ЦІКАВЕНКА,
суддзя Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь.

Удасканаленне зойме час

Канстытуцыйны суд вывучае магчымыя рэформы ў Асноўным Законе краіны

Аб гэтым расказала намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь Наталля КАРПОВІЧ падчас адкрытай лекцыі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Падчас вялікай гутаркі Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка сказаў журналістам, што даў даручэнне Канстытуцыйнаму суду падрыхтаваць некаторыя змены ў Канстытуцыі. Спецыялісты вывучаюць магчымыя кірункі карэкціроўкі нормаў у Асноўным Законе, паведаміла намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда.

Яна нагадала, што Канстытуцыя замацоўвае асновы канстытуцыйнага ладу, прававое становішча асобы, сістэму дзяржаўнай улады, асноўныя паўнамоцтвы дзяржаўных органаў і іншых органаў дзяржаўнай улады, а таксама асновы фінансава-крэдытнай сістэмы краіны.

Лектар заўважыла, што Канстытуцыя прадугледжвае дастаткова працяглы перыяд як грамадскіх абмеркаванняў, якія датычацца ўнясення змяненняў у яе, так і праходжання гэтых змяненняў праз парламент.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што ў найбліжэйшыя два гады змены Канстытуцыі чакаць не варта. «Цяпер мяняць выбарчае заканадаўства, а тым больш Канстытуцыю, у гэтыя два гады, перад прэзідэнцкімі і парламенцкімі выбарамі нельга. Вельмі важна зберагчы стабільнасць у грамадстве і паклапаціцца аб дабрабыце людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

НЕПРЫБЫТКОВЫ ЛЁН

Вось ужо некалькі гадоў на Гродзеншчыне не ўдаецца дасягнуць планавых паказчыкаў па вытворчасці лёну. У КДК Гродзенскай вобласці разбіраліся, дзе дае збой тэхналагічны ланцужок. Аказалася, што ўвесь працэс — ад нарыхтоўкі да перапрацоўкі — мае пэўныя хібы.

Перад аграрыямі рэгіёна стаіць задача нарыхтаваць у год 8,7 тысячы тон ільновалакна. Але фактычна ў мінулым годзе ўдалося атрымаць толькі 3,2 тысячы тон. Менш за план у 2,5 раза.

Асноўная прычына — у фінансавым стане заводаў, які нельга назваць здавальняючым. Пры гэтым, адзначаюць у КДК, прадпрыемствам аказваецца дзяржпадтрымка. Напрыклад, за апошнія два гады было выдзелена з бюджэту амаль 11,5 млн рублёў на закупку абсталявання. Вось толькі не ўсюды яно выкарыстоўваецца эфектыўна. Так, на ААТ «Карэлічы-Лён» бельгійская лінія, якая абышлася ў 420 тысяч рублёў, загружана толькі на 20 %, пры гэтым тэхнічныя характарыстыкі прадукцыі значна ніжэйшыя, чым дазваляе абсталяванне. І такая сітуацыя не адзінкавая. На заводзе ў Дзятлаўскім раёне набыта лінія за 580 тысяч рублёў, а яе загрузка ў студзені — кастрычніку мінулага года склала толькі 11 %.

Нізкая вытворчасць не дазваляе справіцца з дзяржзаказам па валакне. Калі два гады таму пастаўкі набліжаліся да планавых, то ў 2018-м выканана толькі 67 % ад патрэбнага. Спецыялісты КДК высветлілі, што праблема пачынаецца ад парушэння тэхналогіі вырошчвання лёну.

Пад пасевы выдзяляюцца не самыя лепшыя землі, а таксама не вытрымліваюцца тэрміны сяўбы. Складана ідуць справы з падкормкай. Яе папросту не хапае. Спецыялісты КДК звярнулі ўвагу, што і пад сёлетні ўраджай частка земляў не адпавядае патрабаванням па гумусе.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Учынак

У Печах афіцэр закрыў салдата ад гранаты

Надзвычайнае здарэнне адбылося 14 сакавіка. Падчас планавых заняткаў па агнявой падрыхтоўцы адпрацоўвалася кіданне ручной наступальнай гранаты РГД-5. Так здарылася, што салдат тэрміновай службы ўпусціў баявую гранату ў акоп.

— Кіраўнік заняткаў, старшы лейтэнант Дзмітрый Філіповіч, праявіў мужнасць і вытрымку, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны. — Ён літаральна выкінуў салдата за межы акопа і закрыў яго ад асколкаў сваім целам. Абодва вайскоўцы атрымалі нязначныя траўмы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Ну і ну!

На прыгожае жыццё

Украў 16 тысяч долараў у жонкі

У сталіцы супрацоўнікі міліцыі затрымалі раней судзімага жыхара горада, які здзейсніў гэта.

Да праваахоўнікаў звярнулася жанчына з заявай аб знікненні грашовых сродкаў з кватэры. Было ўстаноўлена, што да прапажы датычны муж заяўніцы. Як паведамілі ў Партызанскім РУУС Мінска, 63-гадовы мужчына нядаўна вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі. Прыехаўшы да жонкі, ён даведаўся, што яна атрымала буйную суму грошай у спадчыну. Дачакаўшыся, калі жанчына сыдзе з дому, зламыснік знайшоў 16 тысяч долараў, сабраў свае рэчы і адправіўся ў бок вакзала, дзе пасля і быў затрыманы аператыўнікамі.

Як растлумачыў сам зламыснік, ён збіраўся з'ехаць у Маскву, дзе пражывалі яго сваякі, і выдаткаваць грошы на прыгожае жыццё.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сталічны ЧАС

● Суботнікі па ўборцы, добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторый стартуюць у Мінску 16 сакавіка. Аб'явы аб плануемых мерапрыемствах размешчаны на сайтах раённых адміністрацый, паведамляе БелТА. Падчас суботнікаў прывядуць у парадак двары, плошчы, вуліцы, скверы, паркі, зоны адпачынку і іншыя аб'екты сацыяльна-бытавога і культурнага прызначэння, мемарыяльныя комплексы, месцы баявой і воінскай славы, тэрыторыі арганізацый, будаўнічых пляцовак.

● Летась камунальныя арганізацыі сталіцы зарабілі 146,5 мільёна рублёў за кошт арэнды дзяржаўнай маёмасці, якая знаходзіцца ва ўласнасці горада, паведамілі ў камітэце дзяржаўнай маёмасці Мінгарвыканкама. Асноўнымі арэндадаўцамі аб'ектаў нерухомасці выступаюць жыллёвыя рамонтна-эксплуатацыйныя арганізацыі раёнаў сталіцы, Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці, Галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама і КУП «Мінская спадчына». Цяпер ва ўласнасці Мінска знаходзіцца больш за 10,8 мільёна квадратных метраў плошчаў.

Надвор'е

Ужо нават уначы з плюсам

Пачынаючы з нядзелі сіноптыкі абяцаюць да плюс 16 градусаў

У першай палове гэтага тыдня зіма нагадала пра сябе пахаладаннем і снегападамі ў паўднёвых раёнах нашай краіны. Але пахаладанне было нямоцным і аказалася непрацяглым. Ужо ў чацвер атмасферныя франты прынеслі на тэрыторыю краіны больш цёплае паветра з Заходняй Еўропы. На выхадныя чакаюцца дажджы і пацяпленне, найбольш істотнае — на паўднёвым захадзе краіны, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень пад уплывам атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы, на значнай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём ападкі будуць суправаджацца парывістым ветрам. Максімальная тэмпература паветра складзе 5—10 цяпла. У суботу франтальныя раздзелы прынясуць нам часам дажджы, па паўночным усходзе — з мокрым снегам. Месцамі чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — 3—10 цяпла.

У нядзелю ўначы надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты, а ўдзень у краіну з паўднёвага захаду Еўропы пачне паступаць цёплая паветраная маса. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень па поўначы пройдуць кароткачасовыя дажджы. Раніцай у некаторых раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў. Удзень будзе 7—13 цяпла, па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да 14—16 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак уначы месцамі, раніцай і днём у многіх раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 6 градусаў. Удзень прагназуецца досыць цёплае надвор'е — плюс 6—13 градусаў, а па паўднёвым усходзе яно будзе амаль красавіцкае — 15—16 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ГУЛЬНІ ЗБІРАЮЦЬ «ЗОРАК»

За месяц да старту на стадыёне «Дынама» выступіць гурт «Каста» і Святлана Лабада

Маштабны спартыўна-культурны фестываль «Bright Festival» адбудзецца 11 мая на Нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама», ён будзе складацца з некалькіх блокаў. Ініцыятарамі фэсту сталі фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года», ТАА «Джэт Фэст» і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

З 15.00 на аб'екце стартуюць розныя зоны актыўнасці, наведвальнікі змогуць выпрабаваць сябе на дзясятках інтэрактыўных пляцовак федэрацый па відах спорту, а таксама сустрэцца з вядомымі беларускімі спартсменамі. На стадыёне будуць прадстаўлены песенныя і танцавальныя батлы, конкурсы, фота-зоны, майстар-класы, фудкорт.

«Фестываль збярэ поўны стадыён «Дынама», для нас гэта стане добрым тэстам, у першую чаргу перад цырымоніямі адкрыцця і закрыцця II Еўрапейскіх гульняў, мерапрыемства дазволіць зразумець, да чаго рыхтавацца, — расказвае **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ.** — Першае адказнае мерапрыемства на стадыёне прайшло летась, гэта футбольны матч мінскага «Дынама» і піцерскага «Зеніта», але там была адмысловая катэгорыя гледачоў — футбольныя балельшчыкі, тут жа гледачы будуць розныя».

Арганізацыяй фестывалю займаецца кампанія «Джэт Фэст», у паслужным спісе якой арганізацыя найстарэйшага фестывалю краіны «Космас наш!» і «Рок за Баброў». У фэсце «Bright Festival» прымуць удзел самыя вядомыя беларускія выканаўцы, такія як J-Морс і «Ляпіс-98», а таксама папулярныя выканаўцы з суседніх краін, у ліку якіх Святлана Лабада і гурт «Каста», а хэдлайнер мерапрыемства пакуль трымаецца ў таямніцы.

«Для нас велізарны гонар быць часткай яркай каманды, — адзначае **сузаснавальнік і дырэктар кампаніі «Джэт Фэст» Аляксандр КОСАЧ.** — Нам хацелася б зрабіць гэты фестываль максімальна даступным для ўсіх слаёў насельніцтва, магчымасці стадыёна «Дынама» і ідэя дазваляюць. На свяце будуць задзейнічаны не толькі трыбуны стадыёна, але само ядро, на якое пакладуць спецыяльнае пакрыццё».

Білеты на фэст ужо паступілі ў продаж, за першыя тры дні іх было прададзена каля трох тысяч. Цяпер іх кошт складае 25 рублёў, невялікае павышэнне цэн запланавана пасля 20 сакавіка.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

«Боінг» рэкамендаваў прыпыніць палёты самалётаў 737 Max

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп распарадзіўся неадкладна прыпыніць палёты Boeing 737 Max 8 і Max 9 у сувязі з крушэннем лайнераў у Эфіопіі і ў Інданезіі. Сама авіякампанія падтрымала рашэнне прэзідэнта і рэкамендавала Федэральнаму ўпраўленню грамадзянскай авіяцыі прыпыніць палёты ўсіх самалётаў гэтай лінейкі. «Boeing па-ранейшаму цалкам упэўнены ў бяспецы 737 Max. Аднак пасля кансультацыі з Федэральным авіяцыйным упраўленнем ЗША, Нацыянальным саветам па бяспецы на транспарце ЗША і авіяцыйнымі ўладамі і іх кліентамі па ўсім свеце Boeing з-за павышаных мер засцярогі і каб супакоіць авіяцыйную грамадскасць наконт бяспекі гэтага самалёта рэкамендаваў Федэральнаму ўпраўленню часова прыпыніць палёты ўсяго парку Boeing 737 Max у колькасці 371 машыны па ўсім свеце», — адзначаецца ў паведамленні Boeing. Эксплуатацыя паветраных суднаў гэтай серыі пачалася ў 2017 годзе. Мадэль з'яўляецца самым прадаваным самалётам у гісторыі кампаніі. Як паведаміў БелТА дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём Сікорскі, цяпер паветраныя судны гэтай мадэлі ў Беларусі не эксплуатуюцца.

У бразільскай школе застрэлілі дзесяць чалавек

Сама меней дзесяць чалавек загінулі ў выніку страляніны ў адной са школ штата Сан-Паўлу ў Бразіліі, яшчэ 17 атрымалі раненні. Пра гэта паведаміла бразільскае інфармацыйнае агенцтва Agencia Brasil. Як стала вядома, двое ўзброеных падлеткаў у чорнай вопратцы і масках уварваліся ў будынак навучальнай установы і адкрылі агонь па дзецях, якія выйшлі з класаў на перамену. Прычым у аднаго з тых, хто нападаў, быў рэвальвер, а ў другога — лук са стрэламі (магчыма, арбалет). Паліцыя пазней знайшла ў навучальнай установе самаробнае выбуховае прыстасаванне. Пасля масавага расстрэлу тыя, хто напаў, пакончылі з сабой. Па словах прадстаўнікоў уладаў, асобы нападнікаў устаноўлены, аднак не выдаюцца ў інтарэсах следства. Раней яны не прыцягваліся да крымінальнай адказнасці. Версія пра тое, што нападнікі наведвалі гэтую навучальную ўстанову, не пацвердзілася.

«Фэйсбук» перажыў найбуйнейшы збой

У рабоце «Фэйсбука» і «Інстаграма» адбыўся збой, які закрануў карыстальнікаў па ўсім свеце. Гэта датычылася і месенджараў «Фэйсбука» і WhatsApp. Для кампаніі гэта самы сур'ёзны збой у рабоце за ўсю яе гісторыю, ён працягваўся большую частку дня. Апошні раз «Фэйсбук» перажываў падобныя праблемы ў 2008 годзе, калі ў яго было 150 мільёнаў карыстальнікаў. Цяпер іх каля 2,3 мільярда. Хоць галоўная старонка сацсеткі была даступная, многія карыстальнікі паведамлялі, што не маглі нічога там посціць. Карыстальнікі «Інстаграма» скардзіліся, што не маглі абнаўляць стужку і дадаваць новыя фатаграфіі. Паводле звестак сэрвісу Downdetector, які сачыў за работай папулярных сетак, праблема была глабальнай.

Правы спажыўца

ІНТЭРНЭТ — ЗОНА РЫЗЫКІ ЦІ КАМФОРТНЫХ ПАКУПАК?

Па стане на 1 студзеня гэтага года ў гандлёвым рэестры Рэспублікі Беларусь было зарэгістравана 19 400 інтэрнэт-крамаў. За 2018 год іх колькасць павялічылася на 20 працэнтаў. Доля інтэрнэт-гандлю ў агульным тавараабароце складае зараз 3,4 працэнта. Улічваючы агульнасусветную тэндэнцыю інтэнсіўнага развіцця гандлю ў сеціве, Сусветны дзень абароны правоў спажыўцоў было вырашана правесці ў Беларусі пад дэвізам «Абарона спажыўца ў эпоху разумных тэхналогій».

— Сярод тавараў, якія беларусы набываюць праз інтэрнэт-крамы, на першым месцы — бытавая тэхніка і электроніка, на другім — аўтатавары, а на трэцім — тавары для прыгажосці і здароўя, — расказала на сустрэчы з журналістамі **начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК.** — Яшчэ адна агульнасусветная тэндэнцыя, характэрная і для нашага рынку: усё часцей пакупнікі для набыцця тавараў праз інтэрнэт выкарыстоўваюць уласныя смартфоны.

Па даных міжнародных даследаванняў, адной з глабальных праблем інтэрнэт-гандлю з'яўляецца давер да прадаўца.

«Спажыўцу вельмі важна ведаць, хто прадае яму тавар, а калі такой інфармацыі на сайце няма, то я б катэгарычна не раіла здзяйсняць там пакупкі, — падкрэслівае Іна Гаўрыльчык. — Для спажыўца важна, ці чуе яго прадавец, ці адказвае кампетэнтна на ўсе пытанні, якія яго цікавяць, ці тэлефануюць яму своечасова, ці гатовы разглядаць прэтэнзіі і скаргі. Прасцей кажучы, пакупнік хоча быць упэўнены з тым, што яго права на вяртанне грошай за няякасны тавар будзе забяспечана прадаўцом. Мушу заўважыць, што яшчэ некалькі гадоў таму спажыўцы сумняваліся ў тым, што ім удасца потым знайсці прадаўца, ды і самі прадаўцы лічылі, што ніхто іх не знойдзе і адказнасці яны не нясуць. Але дзякуючы змяненням, што былі ўнесены ў заканадаўства, удалося віртуальны свет наблізіць да рэальнага і забяспечыць абарону правоў спажыўцоў».

Вельмі важным крокам стала стварэнне Гандлёвага рэестра і абавязковая рэгістрацыя ў ім усіх суб'ектаў гаспадарання, якія працуюць у інтэрнэце. Цяпер, калі спажывец зацікавіўся таварам у той ці іншай інтэрнэт-краме, ён можа самастойна праверыць, ці працуе яна на законных падставах. Для гэтага дастаткова зайсці на сайт МАРГ, знайсці ўкладку «Гандлёвы рэестр Рэспублікі Беларусь», зарэгістравацца і атрымаць інфармацыю, ці ёсць такі прадавец у яго базе.

На сайце інтэрнэт-крамы павінна прысутнічаць назва арганізацыі (прадаўца), юрыдычны адрас, кантактныя тэлефоны, рэжым працы, поўная інфармацыя аб тавары, якая дазваляе спажыўцам зрабіць усвядомлены выбар, цана на тавар, гарантыйны тэрмін, умовы аплаты, тэрміны, умовы, а таксама кошт дастаўкі тавару.

Іна Гаўрыльчык звярнула ўвагу на важную акалічнасць: інтэрнэт-прадавец абавязаны забяспечыць магчымасць дыстанцыйнага пералічэння сродкаў. Па законе «Аб абароне правоў спажыўцоў» у пакупніка павінен быць выбар: ён можа разлічвацца ў наяўнай ці безнаяўнай форме.

— І калі прадавец адмаўляецца ад атрымання грошай па безнаяўным разліку (аплатай па банкаўскай картцы), то я рэкамендавала б спажыўцу задумацца над тым, ці варта мець справу з такім прадаўцом, таму што гэта з'яўляецца прыкметай нядобрасумленных паводзінаў, у тым ліку ў адносінах да пакупніка, — папярэджвае спецыяліст. — І майце на ўвазе, што забараняецца ўстанаўліваць розныя цэны і тарыфы ў залежнасці ад формы аплаты тавару. На жаль, некаторыя прадаўцы спрабуюць увесці пакупнікоў у зман і кажуць ім, што пры безнаяўнай форме аплаты кошт тавару будзе вышэйшы. Гэта парушае дзеючае заканадаўства.

Да таго ж на сайце інтэрнэт-крамы павінен у абавязковым парадку размяшчацца ўзор дакумента, якія пацвярджае факт набыцця тавару: выява ці фота касавага чэка. Паглядзіце ўважліва, які суб'ект гаспадарання там напісаны, а пры продажы вам тавару паглядзіце ў свой чэк: ці той жа суб'ект прадаў вам заказаны на сайце тавар.

«Забараняецца ўстанаўліваць розныя цэны і тарыфы ў залежнасці ад формы аплаты тавару».

Сёння на многіх замежных інтэрнэт-рэсурсах актыўна рэкламуюцца тавары, рэалізацыя якіх праз інтэрнэт забаронена на тэрыторыі нашай краіны. «Ніколі не купляйце лекі і БАДы ў інтэрнэце, — раіць Іна Гаўрыльчык, — таму што ніхто не можа гарантаваць іх бяспечнасць. Набываючы такі тавар, вы сур'ёзна рызыкуеце не толькі сваімі грашыма, але і здароўем, і нават жыццём. Незаконным з'яўляецца і продаж тавараў праз сацыяльныя сеткі. Інтэрнэт-крамы могуць рэкламаваць сябе ў сацыяльных сетках, але ў такой рэкламе абавязкова павінна прысутнічаць гіперспасылка на сайт інтэрнэт-крамы, які працуе ў нацыянальным сегменце сеткі інтэрнэт. Апошнім часам пачасціліся скаргі на тавары, набытыя ў сацыяльных сетках. Але ў гэтым выпадку прадаюць не інтэрнэт-крамы, а фізічныя асобы. І на такія здзелкі не распаўсюджваецца закон «Аб абароне правоў спажыўцоў». Справу можна вырашыць толькі ў судзе. Але часцей за ўсё, пасля здзяйснення здзелкі прадавец перастае адказваць на званкі, напэўна, уносячы тэлефон пакупніка ў чорныя спісы».

Карыснай для спажыўцоў будзе і наступная інфармацыя. Згодна з рэкламным заканадаўствам распаўсюджванне рэкламы з дапамогай мабільнай сувязі і электроннай пошты дапускаецца толькі са згоды абанента ці адрасата на яе атрыманне. Рэкламная рассылка можа адбывацца ў «Вайберы», «Твітэры» і іншых месенджарах. Здараецца, што пакупнік пагаджаецца на атрыманне рэкламы, а потым яго рашэнне змяняецца, ці ён проста забываецца, што даў згоду, напрыклад пры запаўненні анкеты на бонусную картку. «Майце на ўвазе: калі рэкламадаўца кажа, што не можа адключыць канкрэтнага спажыўца ад рассылкі рэкламы, ён кажа няпраўду, — звяртае ўвагу Іна Гаўрыльчык. — Па першым патрабаванні спажыўца рэкламадаўца абавязаны адключыць рэкламную рассылку, прычым у заканадаўстве не агаворваецца, у якой форме павінна быць агучана такое патрабаванне. А гэта азначае, што дастаткова і тэлефоннага званка...»

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЖЫЛЛЁВЫЯ ЎМОВЫ НА НОВЫ ЛАД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з тым дэпутат адзначыў пасіўнасць людзей падчас грамадскага абмеркавання Жыллёвага кодэкса. У камісію паступіла больш як 400 прапаноў. Больш сотні з іх — ад дэпутатаў, і толькі 14 — ад 12 грамадзян. Для параўнання, пры абмеркаванні праекта закона аб абыходжанні з жывёламі прапаноў было больш як 1100.

Упаўнаважаны на кіраванне за 3,2 капейкі з метра

Закон аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) рыхтуецца да разгляду ў першым чытанні на наступнай сесіі. Пры гэтым, каб паскорыць працэс, ужо створана рабочая група для падрыхтоўкі гэтага дакумента да другога чытання.

Адно з галоўных новаўвядзенняў закона — стварэнне ўпаўнаважанай асобы па кіраванні агульнай маёмасцю. Такога чалавека пасля прафесійнай падрыхтоўкі і навучання будуць прызначаць мясцовыя органы кіравання. Жыхары могуць адмовіцца ад прызначэння ўпаўнаважанага, аднак тады ім прыйдзецца ствараць у доме таварыства ўласнікаў, каб іх інтарэсы прадстаўляў старшыня.

— Такая прапанова ўносіцца дзеля таго, каб маёмасць дамоў, дзе не існуе ніякага кіравання, нейкім чынам даглядалася. Самае цікавае, што гэты законапраект працуе і цяпер, аднак жыхары чамусьці не карыстаюцца яго магчымасцямі, — заўважыў старшыня камісіі.

Мяркуецца, што ўпаўнаважаная асоба ад імені грамадзян будзе заключаць дагаворы з арганізацыямі, якія аказваюць паслугі, і зможа адстойваць інтарэсы ўласнікаў нават у судзе. Пры гэтым дагаворы, што былі заключаны з грамадзянамі раней, не трэба будзе перарабляць нанова. Нягледзячы на тое, што такая пасада стане пэўным дадатковым звяном, дэпутаты спадзяюцца, што яе стварэнне спросціць жыццё людзей.

Плануецца, што чалавек будзе займаць толькі пасаду ўпаўнаважанага і атрымліваць зарплату, а не сумяшчаць работу з асноўнай, як гэта часта робіцца цяпер, калі за агульнай маёмасцю вызначаюць сачыць некага з работнікаў ЖКГ. Пры гэтым у адной асобе не павінны спалучацца і ўпаўнаважаны, і той, хто абслугоўвае жыллё.

— На пасадзе ўпаўнаважанай асобы павінен быць чалавек, які будзе займацца толькі пэўным жыллём, — мяркуе Юрый Дарагакупец. — Міністэрства ЖКГ прапаноўвае плаціць такім людзям зыходзячы са сродкаў, якія плаціць насельніцтва. Калі асобным радком будуць прапісаны адлічэнні на ўтрыманне гэтай асобы, то можна зменшыць нейкія іншыя затраты, напрыклад на тэхабслугоўванне. Або расходы гэтыя ўлічаць пры чарговым штогадовым павышэнні камунальных паслуг на пяць долараў.

Цяпер у сталіцы працуе 620 упаўнаважаных асоб. Калі пералічыць сярэдні заробак у тысячу рублёў, які ўстанавіў кіраўнік дзяржавы, на квадратныя метры, атрымаецца, што кошт гэтай паслугі на кожны метр складзе 3,2 капейкі. Іх і прапануецца вычленіць з кошту іншых паслуг, удакладніў ён.

Чарга, арэнда, высяленне

Замацоўваецца палажэнне пра немагчымасць высялення з жылля членаў і былых членаў сям'і ўласніка, якія на момант прыватызацыі пражывалі з ім, аднак не ўдзельнічалі ў прыватызацыі. Тое ж датычыцца і членаў сям'і ўласніка жылля, якое было збудавана з дзяржпадтрымкай.

— Яны не могуць застацца без жылля, — упэўнены старшыня камісіі. — Часта пры скасаванні шлюбу і падзеле маёмасці жыллё дастаецца таму, на каго былі аформлены правы ўласнасці пры будаўніцтве, і другі бок застаецца ні з чым. Прыняцце новай нормы дазволіць абараніць правы былой паловы. А таксама дзяцей, якім у жыллі дастануцца пэўныя долі.

Разам з тым, чалавека, які жыве ў інтэрнаце і не ўтрымлівае жылплошчу ў належным стане, могуць выселіць.

Адна з асноўных змен кодэкса закране арэнднае жыллё. Людзі, якія пражываюць у такіх памяшканнях, аднак маюць права на сацыяльнае жыллё, змогуць перавесці арэнднае жыллё ў сацыяльнае. Праўда, толькі аднойчы.

Пра пахаванні, цыгарэты і маладажонаў

Закрануў старшыня камісіі і тэму пастаяннага павелічэння колькасці сталічных жыхароў за кошт прыезджых з рэгіёнаў:

— Раней чалавек, які прыязджаў на работу ў сталіцу, жыў, як правіла, у інтэрнаце, прычым нават дзесяцігоддзямі. І гэта было прымальна. Цяпер той, хто прыязджае ў сталіцу, адразу набывае жыллё, калі ёсць грошы. Аднак абмежаванні павінны быць. Мы ж усе кадры забіраем з вёскі, а хто будзе карміць сталіцу праз 50 гадоў?!

Дарэчы, сужэнцы, якія пабраліся шлюбам упершыню, згодна з новымі зменамі, могуць трапіць у чаргу асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў толькі тады, калі ў іх адсутнічае маёмасць не толькі ў сталіцы, але і ў Мінскім раёне.

Пры атрыманні даведак, што даюць падставу лічыцца асобамі, якія маюць патрэбу ў жыллі, будзе разглядацца, якой якасці жыллё у іх ёсць, ці адпавядае яно санітарным нормам і правілам, ці прыдатнае яно для жыцця. І ў кожным выпадку падыходзіць трэба індывідуальна. Пры гэтым метраж падлічвацца, пэўна, будзе па нормах у 10 квадратных метраў на чалавека ў Мінску і па 15 — на раёне, мяркуе Юрый Дарагакупец.

У новым Жыллёвым кодэксе пашыраюць таксама пералік абавязкаў наймадаўцаў памяшканняў, арганізацый-забудоўшчыкаў і тых, што абслугоўваюць жыллё. Больш дакладна прапісваюць паўнамоцтвы мясцовых органаў улады і шмат іншага.

Зменамі ў Закон аб пахаванні і пахавальнай справе ўносіцца норма, якая афіцыйна забараняе іншыя формы пахаванняў, акрамя захавання ў зямлю ці спальвання ў крэматорыі і размяшчэння урны ў калумбарыі. Развейваць прах забаронена.

У новы закон хочуць увесці яшчэ норму, якая, па рашэнні мясцовых распарадчых органаў улады, дазволіць хаваць людзей на могілках, якія ўжо закрытыя. Калі магчымасці дазваляюць пашырыць межы могілак, лепш тут хаваць, чым арганізоўваць новае месца для пахавання, лічыць Юрый Дарагакупец.

Ён акрэсліў і асноўныя змены, якія прадугледжаны Дэкрэтам № 2, што датычыцца антытытунёвага заканадаўства. З 1 студзеня 2020 года прадаваць цыгарэты ў крамах плошчай ад 1000 метраў можна будзе толькі ў спецыяльных аддзелах. А з 1 студзеня 2022-га — знікнуць і палічкі з тытунёвымі вырабамі, якія цяпер знаходзяцца каля месцаў касіраў.

Ірына СІДАРОК.

У ПОШУКАХ ШЧАСЦЯ

Пашка — адзін з тых нямногіх выпускнікоў, якія пасля школы не махнулі за блізкі свет шукаць свайго шчасця, а засталіся ў роднай вёсцы. І, відаць, не прапалі б, калі б...

Некага з такіх хлопцаў падвяла так званая зладзейка з наклейкай, а вось Пашу — залішняя сарамлівасць. Пазбягаў ён, бедны, дзяўчат і толькі пасля сарака, пахаваўшы бацькоў, узяўся шукаць сваю палавінку. Дзе? Ну вядома ж, на сайтах знаёмстваў. На прыгажунь ды вялікіх разумніц ён не замахваўся: падбіраў маладзіц па сабе, смела вёў дыялогі. Да адной дык нават пад'ехаць збіраўся — пад Новы год... (Не маладзён, як быццам, а ўсё ж спадзяваўся на калядны цуд).

І, трэба сказаць, не дарэмна. Аднойчы, позна павячэраўшы, ён ужо забурыўся ў ложак: уключыў тэлевізар, пагладзіў ката, неспадзеўкі задрамаў і таму аж падскочыў ад званка мабільніка. «Пашачка, — пачуў у трубцы гуллівы голас Анжэлы. — Я сама да цябе прыехала... Стаю на станцыі, мерзну. Ты забярэш?..»

Расхваляваны халасцяк у трусах забегаў па хаце: заправіў ложак, прыбраў з вачэй брудны посуд, схаваў пад матрац каляндар з голымі дзеўкамі, наступіў на лапу кату, які таксама быў у шоку, бо ніколі не бачыў гаспадара такім узрушаным і потым з акна ва ўсе вочы глядзеў, як Пашка на старэнькім «Фольксвагене» выязджае з двара.

...Адзінокая фігурка на станцыі падалася яму не такой танклявай, як на фота. Усё астатняе ён разгледзець не паспеў: Анжэла абхапіла яго за шыю і прагна пацалавала, ад чаго ў жаніха закружылася галава, задрыжэлі рукі і ногі.

На драўляных, можна сказаць, ён вёў машыну, прапускаў Анжэлу ў хату. А распрануў і разгубіўся: стройнымі ў яго абранніцы былі хіба ногі. Усё астатняе перавышала бачанае ў камп'ютары як мінімум удвая. Але ж...

Госцю трэ было частаваць, а чым, — Пашка не ведаў. Стаў казаць, што не чакаў, што трымаецца посту, што ў халадзільніку «хіба мыш вісіць»...

— Ды не парся ты! Нясі днушку і нож, — супакоіла Анжэла і з невялічкай дамскай сумачкі дастала... бутэльку і кавалак сала.

Гаспадар прынёс талерку квашанай капусты, хлеб і слоік кампоту, на стол паставіў посуд, папярэдзіў, што амаль не п'е.

Анжэла ўгаворваць яго не стала: плюхнула ў чарку гарэлкі, выдала кароткае «Ну, за нас!», чокнулася з яго шклянкай з кампотам і па-заліхвацку выпіла.

Размова пацякла жывей, блізасць жанчыны, няхай і не той, што малявалася ў думках, кружыла Пашкаву галаву. «Касела» тым часам і дама сэрца: усё гучней смяялася, несла нейкае глупства, нарэшце ўстала, памкнулася да Пашы з абдымкамі, але упала на канапу і... заснула. «Нічога, стамілася, намерзлася, — апраўдваў яе гаспадар, не заўважыўшы, што бутэлька амаль пустая. — Да раніцы праспіцца».

З такой аптымістычнай думкай ён залез пад коўдру і як быццам стаў засынаць, але тут канапа скаланулася ад моцнага храпу. Кот з перапуду сігануў з пакоя і зашыўся недзе ў кухні. Пашка накрыў галаву падушкай, але гэта не дапамагала. Прыйшлося ўстаць, пабудзіць Анжэлу, прымусіць павярнуцца на адзін бок, потым на другі...

Марны лёс, як той казаў: храп гучаў усё мацней і мацней.

Пад яго раскаты, адгараваўшы амаль да раніцы, Пашка ўрэшце не вытрымаў — пабудзіў «спявачку», сказаў, што яму тэрмінова трэба ехаць, бо захварэла цётка, што па дарозе ён падвязе Анжэлу на цягнік...

Сонная госця спаўзла з канапы, укулілася ў машыну і зноўку гучна захрапла. Толькі пасадзіўшы яе ў вагон, Пашка з палёгкай уздыхнуў, даехаў да дома і ўжо там «адарваўся» — соладка заснуў...

Прачнуўся зноў ад званка мабільнага:

— Пашачка, я дабралася, у мяне ўсё добра! — лапатала Анжэла. — Калі мы яшчэ раз сустрэнемся?

— Не ведаю, Анжэла... Дай мне ад гэтай сустрэчы адысці, — без цырымоній адрэзаў ён. Потым на ранейшае месца павесіў каляндар са стройнымі дзеўкамі і сказаў сам сабе: «Дрэнна без жонкі, але ж і з такой...»

Кот толькі згодна мурknуў.

Алена Несцяронак,
г. Докшыцы.

ДУРНЫЯ ЖАРТЫ ПЛАЧУ ВАРТЫ

З маёй новай знаёмай цікава і лёгка. Яна не скардзіцца на здароўе, надвор'е, цэны... У яе, нягледзячы на ўзрост (80 з хвастом), захаваліся і ясны розум, і гумар. Відаць, таму яе расказы пра перажытае можна слухаць гадзінамі. З адной жыццёвай прыгоды мы нядаўна ад душы пасмяяліся.

«Мне тады 26 было, — расказвала прыяцелька. — Сыночку — тры. Бацька яго, а мой, значыць, муж, трагічна загінуў, і я, каб заняць свае думкі, пазбыцца тугі, паступіла ў інстытут. Завочна вучылася ў Маскве, а працавала тут, у Мінску, тэлефаністкай.

Калектыў у нас быў жаночы, толькі начальнік — мужчына, гадоў пад пяцьдзясят. Тады вось такія пажылыя да дзяўчат, маладзейшых за сваіх дзяцей, не «клеіліся», не жаніліся. А калі, можа, дзе і было, то — дакладна кажу — не лезлі ў тэлевізар, не выхваляліся тым на ўвесь белы свет... Хоць з катушак часам і з'язджалі.

У нас вось на рабоце быў пакойчык для адпачынку. Дзве канапкі стаялі. У вольны час там можна было пасядзець, пагутарыць, а як нам — дык лепей памаўчаць.

То расселіся мы неяк з дзяўчатамі, адпачываем, і раптам (што яму стрэліла?) на мяне «валіцца» Пятровіч, начальнік наш. Галоўнае, прыхінуўся, рукі мае за спіну завёў, трымае там ды прыгаворвае: «Вось і ўсё: не вырвешся». Я ў адказ: «Пусціце!..» А ён, гад, не чуе... Я тады яшчэ раз: «Пусціце, бо дрэнна будзе!» «А што ты мне зробіш? — смяецца ён мне ў твар. — Анічога ж...»

Як разбярэ мяне злосць, як рвануся, як цапну яго з усёй сілы зубамі...

Ён аж падскочыў і рукі мае адпусціў.

А тут якраз чуем: «Выклікаем Мінск», «Выклікаем Мінск».

Мы з дзяўчатамі бягом на рабочыя месцы (што там з начальнікам — ужо не ў галаве)...

А назаўтра ён з'яўляецца на рабоце і з парога крычыць: «Дзе? Дзе гэта малое (я і праўда ростам не выйшла)?! Яна мне зараз адкажа за гэтую ноч!»

Абступілі яго дзяўчаты, пытаюць, што здарылася? А ён і расказвае: маўляў, дома было ўсё добра, пакуль ён не раздзеўся, пакуль жонка не ўбачыла крывавую «пячатку», прычым — на сцягне, вышэй за калена... Што тады пачалося!. Рэўнасць, абразы, крык... «Разводам цяпер пагражае!» — кажа начальнік.

Дзяўчаты слухаюць, перажываюць ды глядзяць на мяне. А я і нагадваю, што папярэджвала, казала, што дрэнна будзе... А потым дадаю: «Вядзіце сюды сваю жонку. Мы ёй раскажам, як што было, а можа, і пакажам». — «Ты што — хочаш яшчэ раз мяне ўкусіць?» — узвіўся начальнік і як уджалены выбег з апаратнай.

...Трэба сказаць, — завяршыла расказ прыяцелька, — што з ягонага боку гэта была першая і апошняя вольнасць, якую ён дазволіў. Чалавека ж вельмі важна своечасова спыніць».

Што праўда, тое праўда. Аб гэтым і прымаўка наша гаворыць: хто гуляе з агнём, дагуляецца да попелу. Ці не так?

Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

А ПЕЎНІК — НЯХАЙ СПЯВАЕ

Мяняюцца часы — мяняюцца і святы. У нашых продкаў былі спрадвечныя — Каляды, Вадохрышча, Вялікдзень, Сёмуха, у нас — болей савецкія.

У памяці, напрыклад, як святкавалі гадавіны ўтварэння СССР. У школе з гэтай нагоды ладзілі свайго роду парад: кожны клас прадстаўляў пэўную рэспубліку — адну з пятнаццаці. А матэрыялаў жа мала было: геаграфічны атлас, Вялікая савецкая энцыклапедыя, часопіс «Огонек» — вось і ўсё, бадай... Але ж вучні ўсё роўна стараліся: малявалі сцягі ды гербы, выпускалі насценгазеты, вучылі вершы, танцы, песні, з бабулінага саматканага палатна шылі спадніцы ды блузкі (то-бок нацыянальныя строі), запрашалі бацькоў, вяскоўцаў. Для ўсіх было свята! І ўсім цікава.

Не дзіва, што гэтая традыцыя жыла і потым, у час маёй далейшай вучобы — у педвучылішчы, ва ўніверсітэце.

Але ж вось вучоба скончана. Я сама прыехала настаўнічаць у Гомель, у сярэднюю школу № 15, і пасля асенніх канікул ужо ведала, што на парадзе мой 6 «Б» будзе прадстаўляць Латвію.

З дапамогай бацькоў мы зрабілі фабрычныя герб і сцяг, пашылі, можна сказаць, сапраўдныя нацыянальныя касцюмы, выпусцілі прыгожую насценгазету, развучылі танец, вершы. Да таго ж сяброўка Таццяна, з якой мы жылі ў адным пакоі інтэрната, вырасла ў Ліепаі і дапамагла нам развучыць песню. Яна была вельмі знаёмай і простай: «Петушок, погромче пой, разбуди меня с зарей...», але ж мае вучні спявалі яе па-латышску.

У выніку наш клас перамог — заняў першае месца, атрымаў у падарунак вялікі торт...

Тым часам насталі канікулы, і вось неяк раз у нядзелю (гуляць дык гуляць!) мы з той самай сяброўкай з Ліепаі вырашылі паабедаць у рэстаране. Выспаліся, хораша прыбраліся, прыехалі, а там, што называецца, вось табе і гацаца: шыльда на дзвярах: «Абслугоўваецца замежная дэлегацыя».

Ім, карацей, добра, а нам што рабіць? Прыбраліся, як дурніцы... Есці хочацца...

Нібы адчуўшы гэта, дзверы перад намі раптам расчыняюцца, на парозе з'яўляецца адміністратар і запрашае... заходзіць. «Не за тых нас, мусіць, прымае, — думаю я і, што называецца, тармажу». А вось Таня мая ні аб чым не думае. Кажа мне: «Куртутэцы гайлітэ ман» (Петушок, погромче пой) і смела... кіруе да століка.

Што мне застаецца? Адказваю: «Норітыне агрума» (Разбуди меня с зарей) ды крочу за ёю следам.

РЫБЫ. Цяпер час для раскрыцця творчага патэнцыялу, увасаблення ў жыццё новых ідэй. Эмоцыі стабілізуюцца і ўлягуцца. Тыдзень поўны канструктыўных сустрэч і прапаноў, хоць і давядзецца часам займацца аднастайнымі, але неабходнымі справамі. У адносінах да блізкіх добра было б аслабіць сваю патрабавальнасць і крытычнасць, інакш ёсць рызыка справакаваць канфлікты.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.26	19.13	11.47
Віцебск —	7.16	19.02	11.46
Магілёў —	7.16	19.03	11.47
Гомель —	7.12	19.00	11.48
Гродна —	7.41	19.28	11.47
Брэст —	7.41	19.29	11.48

Месяц

Першая квадра
14 сакавіка.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агафона, Арсенія, Багдана, Фёдара, Фядота.*
К. *Клеменса, Людвіка.*

Фота Дар'і ЯШЧАНКІ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

15 САКАВІКА

У краіне

1915 год — нарадзіўся (былая вёска Цесалы, Гарадоччына) Аляксей Іванавіч Семянкоў, генерал-лейтэнант авіяцыі, заслужаны пілот СССР. У Вялікую Айчынную вайну — камандзір эскадрыллі, палка 10-й гвардзейскай транспартнай авіядывізіі. Здзейсніў больш за 500 баявых вылетаў у блакадны Ленінград, да партызан. Удзельнічаў у вызваленні Крыма, ваяваў у Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Румыніі. У ноч на 9 мая 1945 года экіпаж самалёта Лі-2 на чале з Семянковым даставіў у Маскву Акт аб безумоўнай капітуляцыі фашысцкай Германіі. У 1970—1975 гадах 1-ы намеснік міністра грамадзянскай авіяцыі і 1-ы намеснік старшыні Дзяржаўнага авіянагляду СССР. Памёр у 2000 годзе.

1930 год — нарадзіўся (г. Віцебск) Жарэс Іванавіч Алфёраў, савецкі і расійскі вучоны-фізік, акадэмік і віцэ-прэзідэнт Расійскай АН, замежны член НАН Беларусі, Акадэміі навук ГДР, Польскай АН, нацыянальнай АН ЗША. Ганаровы доктар Гарвардскага ўніверсітэта. Лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы. Заснаваў Фонд падтрымкі адукацыі і навукі, у стварэнне якога ўклаў трэць атрыманай ім Нобелеўскай прэміі. Мэтай фонду з'яўляецца падтрымка фундаментальных даследаванняў у галіне фізікі, жыццёва неабходных для развіцця эканомікі. Аўтар больш чым 500 навуковых прац. Памёр у 2019 годзе.

1932 год — адкрыты Беларускі трэці дзяржаўны драматычны тэатр пад кіраўніцтвам Уладзіслава Галубка (БДТ-3). Пастаянная база тэатра была ў Гомелі. У 1937 годзе Уладзіслаў Галубок быў рэпрэсаваны, тэатр расфарміраваны.

1935 год — прынята пастанова ЦВК СССР аб узнагароджанні Беларускай ССР ордэнам Леніна.

1964 год — у Мінску адкрыты радыётэхнічны інстытут (з 1993 года — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі).

У свеце

Сусветны дзень абароны правоў спажыўцоў. *15 сакавіка 1962 года ў пасланні да Кангрэса прэзідэнт ЗША Дж. Кенэдзі сфармуляваў чатыры асноўныя правы спажыўца: права на інфармацыю, права на бяспеку, права на выбар і права быць пачутым. Адзначаецца з 1983 года па рашэнні Міжнароднага саюза спажыўцоў.*

1917 год — у салон-вагоне царскага цягніка на станцыі Пскоў адрокся ад прастола Дзяржавы Расійскай апошні расійскі імператар Мікалай II. Дынастыя Раманавых, якая кіравала ў Расіі з 1613 года, страціла ўладу над краінай. Часовы камітэт Дзяржаўнай думы абвясціў аб стварэнні Часовага ўрада.

1924 год — нарадзіўся Юрый Бондараў, савецкі і расійскі пісьменнік, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай і двойчы Дзяржаўнай прэмій СССР. Аўтар аповесці «Батальёны просяць агню», раманаў «Гарачы снег», «Цішыня», «Бераг», шэрагу публіцыстычных зборнікаў.

1945 год — пачалася Верхнесілезская наступальная аперацыя войскаў левага крыла 1-га Украінскага фронту (камандуючы — Маршал Савецкага Саюза І. С. Коневу). Завяршылася 31 сакавіка. Савецкія войскі авалодалі паўднёва-заходняй часткай Верхняй Сілезіі і выйшлі ў перадгор'і Судэтаў.

УСМІХНЕМСЯ

Я ўжо пяць гадоў хаджу да адной і той жа цырульніцы.

А стрыгуся ў іншай.

— Вось калі мы з сястрой выйдзем замуж, кім будуць прыходзіцца адзін аднаму нашы мужы?

— Братамі.

— У сэнсе?

— Па няшчасці.

Як казаў мой дзядзька Жора: «Выбачайце, але, на жаль, я нічым не хачу вам дапамагчы».

— Фіма, на якую зарплату вы разлічваеце?

— На «вой, гэта ўсё такі мне?».

Што рабілі нашы бацькі, каб забіць нуду, да таго, як вынайшлі інтэрнэт?

Я апытаў усіх 26 сваіх сясцёр і братоў — з іх таксама ніхто не ведае...

— Дзе ваша курсавая, студэнт?

— Я страціў яе ў бойцы з хлопцам, які сказаў, што вы не самы лепшы выкладчык у нашым універсітэце!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 924.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 сакавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

15 сакавіка 2019 г. № 11 (496)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АДКРЫЦЦІ

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЗДАРОЎЕ

Новыя прэпараты для лячэння гепатыту, ВІЧ, дыябету пачнуць выпускаць на беларуска-індыйскім прадпрыемстве ў Скідзелі

Фота Мікалая ЛАПІНА.

НАПАЧАТКУ таблеткі, капсулы, блістары будуць фарміравацца з прывазной сыравіны, але з цягам часу пачне працаваць і завод па выпуску самой субстанцыі. Аб гэтым было заяўлена падчас цырымоніі адкрыцця новага прадпрыемства, будаўніцтва якога вялося пад патранажам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіла Мясніковіча, упаўнаважанага па супрацоўніцтве з Індыяй.

Для сябе і на экспарт

Два гады таму ў фундамент будучага завода была закладзена сімвалічная капсула. Інвестыцыйны праект на суму 3,3 мільёна долараў ажыццявіла індыйская кампанія «Лок Бэта». На айчынным рынку яна працуе 15 гадоў. Новае сумеснае беларуска-індыйскае прадпрыемства атрымала назву «Навалок».

Як адзначыў падчас адкрыцця Міхаіл Мясніковіч, выбар партнёра невыпадковы. Менавіта Індыя лічыцца адным з найбуйнейшых у свеце вытворцаў лекавых прэпаратаў. І для Беларусі яна таксама стратэгічны партнёр. Адтуль паступае 30 % лекаў, сыравіны і субстанцый усяго аб'ему імпарту фармацэўтычнай галіны. З уводам новага прадпрыемства частка неабходных прэпаратаў будзе вырабляцца ў Беларусі. Гэта дасць і значны эканамічны эфект.

Да таго ж у прадпрыемства «Навалок» ёсць планы заняцца экспартам лекаў у межах Еўразійскага эканамічнага саюза.

стар. 2

ТЭМА ТЫДНЯ

КУДЫ РУБЕЛЬ ПАКЛІЧА?

Знешняя працоўная міграцыя асабліва адчувальная на прыгранічных тэрыторыях

На праблему знешняй працоўнай міграцыі, асабліва выезду людзей з высокай кваліфікацыяй, не так даўно звярнуў увагу дэпутацкага корпуса рэгіянальнага ўзроўню спікер верхняй палаты беларускага парламента Міхаіл Мясніковіч. Выступаючы на сумесным пасяджэнні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі і Савеце Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, ён адзначыў, што па даных выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, летась колькасць грамадзян, якія працавалі за межамі нашай краіны (не змяняючы пастаяннага месца жыхарства), складала 95,4 тысячы чалавек. Гэта вышэй за пазалеташні ўзровень.

Больш за ўсё ўплыў ад знешняй працоўнай міграцыі, безумоўна, адчуваюць прыгранічныя тэрыторыі, бо не заўсёды вытрымліваюць канкурэнцыю з прапановамі на рынку працы з боку суседзяў. Напрыклад, гродзенцы часцей за ўсё едуць працаваць у Польшчу ў якасці кіроўцаў — там вялікі попыт на такіх спецыялістаў. Вабіць іх і Літва з аналагічнымі прапановамі. Жыхары Прыдзвінскага краю, ды і не толькі яны, выбіраюць усходні кірунак: Расія, па даных МУС, займае першую прыступку ў перавагах працоўных мігрантаў. Дарэчы, дзве наступныя мы ўжо таксама назвалі.

Чаму нашы суайчыннікі з'язджаюць працаваць за мяжу? Едуць па доўгі рубель, вядома, але які яго кошт?! Некалькі жыццёвых гісторый карэспандэнты «МС» знайшлі ў палескай глыбінцы. Абавязкова да прачытання тым, хто толькі задумваецца аб магчымым выездзе.

А яшчэ мы вырашылі высветліць, ці можна нядрэнна зарабіць у сваёй мясцовасці, напрыклад у невялічкай вёсцы пад Оршай, і не быць пры гэтым айцішнікам і, наогул, як распачаць уласны бізнес на памежжы?

Падрабязней аб гэтым чытайце ў сённяшнім нумары на стар. 3—15.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Аддайце заробак!

З якімі скаргамі часцей за ўсё звяртаюцца працоўныя мігранты. стар. 3

Кіроўцы ў дэфіцыце

540 вакансій такіх спецыялістаў было на Гродзеншчыне на пачатак сакавіка. Чаму? стар. 4

Тысяча з соткі

Гаспадынь вучаць на Аршаншчыне, як няблага зарабіць на сваім кавалку зямлі. стар. 13

Паехаць і... вярнуцца

Некалькі жыццёвых гісторый ад жыхароў палескай глыбінкі. стар. 14

Бізнес на памежжы



Як зарабіць на мухах і манетызаваць уласнае захапленне. стар. 15

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў ЗДАРОЎЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Напачатку пастаўкі на знешні рынак складуць 20 працэнтаў, а праз два гады суадносіны будуць пяцьдзясят на пяцьдзясят. Гэта значыць, што на экспарт пойдзе палова лекавых прэпаратаў.

Аб'ёмы — на 2 мільёны

На беларуска-індыйскім прадпрыемстве будуць выпускаць антырэтравірусныя, антыгіпертэнзіўныя, проціязвавыя, процітуберкулёзныя, уралагічныя сродкі. Кажучы прасцей, яны прызначаны для лячэння такіх хвароб, як дыябет, ВІЧ-інфекцыя, гепатыт, туберкулёз ды іншыя.

Фота Мікалая ЛАПІНА.

У год тут будзе вырабляцца каля 260 мільёнаў таблетак і капсул, 15 мільёнаў блістараў і слоікаў. У грашовым эквіваленце гэта складзе 2 мільёны долараў, і аб'ёмы будуць расці.

— Прадпрыемства арыентавана на вытворчасць процівірусных, антыбактэрыяльных прэпаратаў, якія зараз шырока выкарыстоўваюцца ў сістэме аховы здароўя. І, што вельмі важна, усе яны новага пакалення, — падкрэсліў падчас адкрыцця **міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Валерый МАЛАШКА.**

Ад таблетак да субстанцый

Супрацоўніцтва з індыйскай кампаніяй у фармацыі будзе працягвацца. Зараз ідзе гаворка аб наступным праекце, які накіраваны на вытворчасць субстанцыі для лекаў. Як адзначыў Валерый Малашка, гэта першы падобны праект у рэспубліцы. Яго галоўная асаблівасць у тым, што сыравіна будзе выкарыстоўвацца на беларускіх прадпрыемствах фармацэўтычнай галіны. Яго размесцяць у другой палове будынка, побач з існуючым заводам у Скідзелі.

У краіне плануецца пабудаваць яшчэ два заводы па вытворчасці лекаў з удзелам індыйскага капіталу. Абодва прадпрыемствы з'явяцца ў сталіцы. На месцы аднаго з іх летась быў урачыста закладзены камень. Індыйскі фармацэўтычны гігант, кіраўнік якога мае беларускія карані, інвестуе ў праект мільён долараў. На заводзе наладзяць вытворчасць як лекаў, так і субстанцый. Прэпараты будуць мець экспартны кірунак.

— Гэта вялікі інавацыйны праект, і мы да яго сур'ёзна рыхтуемся, — паведаміў Міхаіл Мясніковіч. — Падключана Акадэмія навук. Індыйскі бок, у сваю чаргу, рыхтуе дасье да рэгістрацыі, каб выйсці на рынак.

Хутка будзе наладжана яшчэ адно сумеснае прадпрыемства, якое таксама знаходзіцца ў Мінску. Беларуска-індыйскія намаганні павінны даць добры эфект у выпуску ўнікальных лекаў, што паспрыяе развіццю айчыннай фармакалогіі, лічыць Міхаіл Мясніковіч. Да таго ж прадукцыя ўласнай вытворчасці таннейшая за прывазную.

Патрэбны прэферэнцыі

Індыя лічыцца надзейным партнёрам. І з пастаўкай лекаў, і з дагаворнымі абавязацельствамі амаль не бывае праблем. Але вырашэнне некаторых пытанняў можа зацягвацца надоўга. Напрыклад, рэгістрацыя лекаў. У такіх умовах вялося і будаўніцтва Скідзельскага прадпрыемства. Каб гандляваць на тэрыторыі Мытнага саюза, таксама трэба было прайсці доўгі працэс узгаднення абодвум бакам — індыйскай кампаніі і беларускаму прадпрыемству «Белмедпрэпараты».

Паскорыць справу маглі б так званыя спецпраекты. Гэта значыць, што інвестар, які стварае адпаведную вытворчасць, атрымлівае дзяржаўныя прэферэнцыі, ільготы, каб мець магчымасць на пачатку сваёй дзейнасці паспяхова выйсці на рынак.

— Савет Рэспублікі выступіў ініцыятарам шэрагу прапаноў па спецпраектах, каб падтрымаць інвестара, айчыннага ці замежнага — без розніцы, — паведаміў Міхаіл Мясніковіч. — Гэта ідэя не новая. Падобная практыка ёсць у казахаў, што дало ім магчымасць значна падтрымаць у тым ліку фармакалагічную галіну. Наколькі мне вядома, 21 спецпраект дзейнічае ў Расійскай Федэрацыі, з іх два — у вытворчасці лекаў. Такім чынам дзяржава стварае спрыяльныя ўмовы для інвестараў, дапамагае ім «раскруціцца» і ўвайсці на канкурэнтны рынак больш камфортна. Пакуль гэта пытанне ў стадыі абмеркавання.

А між тым менавіта інвестыцыйныя праекты спрыяюць развіццю тэрыторый. Напрыклад, у Скідзелі, які не так даўно стаў горадам — спадарожнікам Гродна, дзякуючы новаму заводу створана 30 рабочых месцаў, яшчэ столькі ж з'явіцца ў наступным годзе. Дзякуючы інвестыцыйнаму праекту краіна зможа выйсці на больш якасны ўзровень як у вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў, так і ў лячэнні пацыентаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ІНАВАЦЫЙНАЯ КАДРЫ І ДЫВЕРСІФІКАЦЫЯ

Рэзервы росту эканомікі рэгіёна абмеркавалі на Брэстчыне

Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Брэсцкай вобласці за 2018 год і задачы на 2019-ы абмеркавалі на сумесным пасяджэнні абласнога выканаўчага камітэта і сесіі абласнога Савета дэпутатаў. Удзел у ім узяў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

Са справаздачай выступіў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.** Ён адзначыў станоўчую дынаміку ў развіцці эканомікі. З шасці ключавых паказчыкаў эфектыўнасці чатыры выкананы ў поўным аб'ёме. Стабільная сітуацыя і з фінансавымі паказчыкамі.

— Эканомікай вобласці за мінулы год атрымана 725,5 мільёна рублёў чыстага прыбытку, што складае каля 14 працэнтаў ад рэспубліканскага паказчыка, — паведаміў старшыня аблвыканкама. — Доля стратных прадпрыемстваў скарацілася за апошнія тры гады прыкладна ўдвая, але яшчэ застаецца высокай.

Кіраўнік вобласці адзначыў складаную сітуацыю на прадпрыемствах «Брэстаграсэрвіса», у кансервавай галіне, а таксама на прадпрыемствах канцэрнаў «Беллегпрам» і «Белдзяржхарчпрам». Няпростым быў год і для сельскай гаспадаркі рэгіёна. Найбольш па прычыне засухі гаспадаркі недабралі 235 тысяч тон збожжа, 50 тысяч тон цукровых буракоў, 19 тысяч тон рапсу. І ўсё ж назапашаныя кармы дазволілі атрымаць добрыя вынікі ў жывёлагадоўлі. Павялічылася вытворчасць малака і мяса. Па гэтых паказчыках вобласць займае першае месца ў краіне.

Разам з тым жывёлагадоўля Брэстчыны мае яшчэ вялікія рэзервы. На гэта звярнуў увагу ў сваім выступленні Міхаіл Мясніковіч. Застаецца праблема напаўняльнасці новых фермаў і тых, якія нядаўна пражылі рэканструкцыю. Па стане на 1 студзеня гэтага года са 188 рэканструяваных малочнатаварных фермаў на 32 (17 %) жывёлагадоўчыя памяшканні не запоўнены скацінай пад запланаваную магутнасць. У Баранавіцкім, Іванцэвіцкім, Ляхавіцкім, Маларыцкім раёнах — па адной такой ферме, у Бярозаўскім, Кобрынскім, Лунінецкім — па пяць, у Драгічынскім — дзве, у Іванаўскім, Пінскім — па чатыры, у Столінскім — тры. І хоць у цэлым вобласць выйшла на першую пазіцыю ў краіне, 39 МТФ летась не дасягнулі ўзроўню вытворчасці малака 2017 года. Вось дзе рэзервы.

Іншыя галіны народнай гаспадаркі таксама паказалі нядрэнныя вынікі, гаварылася на пасяджэнні. Заданне па будаўніцтве жылля выканана на 101 працэнт. Адрамантавана і ўведзена ў эксплуатацыю больш за 330 кіламетраў мясцовых аўтамабільных дарог пры заданні 244. Выконваюцца паказчыкі развіцця знешняга гандлю. Сёння сярод партнёраў рэгіёна — 101 краіна, адкрыта дзесяць новых рынкаў збыту. Напрыклад, экспарт у Кітай павялічыўся ўдвая, гандаль з краінамі Еўрасаюза вырас на 15 працэнтаў. Сведчаннем развіцця малога і сярэдняга бізнесу можа служыць стварэнне 722 новых прадпрыемстваў. Стабільна развівалася і сацыяльная сфера.

Паказчыкі развіцця эканомікі былі прынятыя дэпутатамі да ведама як пункт адліку. Але падчас абмеркавання ўдзельнікі засяродзіліся на праблемах і шляхах іх вырашэння. Нямала ўвагі ўдзялялася кадрам. Бо гэта адзін з галоўных складнікаў паспяховага вырашэння пытанняў мясцовага значэння і задач сацыяльна-эканамічнага развіцця ў цэлым.

— Вучобе кадраў, іх падрыхтоўцы трэба ўдзяляць значна больш увагі, — перакананы Міхаіл Мясніковіч. — Можна арганізаваць пастаянную падрыхтоўку на базе аднаго з універсітэтаў альбо знайсці іншыя формы, але кадры трэба рыхтаваць грунтоўна. Кіраўнікоў неабходна расціць, падтрымліваць, а потым вылучаць на адпаведныя пасады.

Гэтая размова ўзнікла пасля абмеркавання сітуацыі з кадрамі ў сельскай гаспадарцы. На 1 студзеня ў вобласці значылася 15 вакансій кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый. Пры гэтым ёсць гаспадаркі, дзе старшыню не могуць прызначыць па два — два з паловай года. «Чаго можна дабіцца ад такой гаспа-

УСЁ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Мінская вобласць у мінулым годзе дынамічна развівалася і захавала лідарства ў краіне: расце экспарт, правільны маркетынг дазволіў значна расшырыць рынкі збыту, летась прыцягнуты 330 мільёнаў долараў замежных інвестыцый.

— Але мая мэта — удзяліць асноўную ўвагу надзённым праблемам людзей: чым яны жывуць, што іх хвалюе. Бадай, самае галоўнае — занятасць і аплата працы. На Міншчыне летась створана амаль 12 тысяч новых рабочых месцаў. У той жа час колькасць звольненых перавысіла колькасць прынятых на работу, — канстатаваў губернатар. — Мадэрнізацыя і адкрыццё сучасных прадпрыемстваў далі магчымасць напоўніць бюджэт. У выніку мы змаглі павысіць зарплату не толькі ў рэальным сектары эканомікі, але і ў сацыяльнай сферы. Сярэдні заробак на Міншчыне ў снежні мінулага года склаў амаль 1135 рублёў.

Сёлета ў цэнтральным рэгіёне плануюць стварыць як мага больш высокапрадукцыйных рабочых месцаў. І гэта цалкам магчыма. У стадыі рэалізацыі звыш 110 інвестыцыйных праектаў. Толькі ўвод у дзеянне на поўную магутнасць Нежынскага горна-ўзбагачальнага камбіната дазволіць сфарміраваць больш за дзве тысячы новых рабочых месцаў. Вялікія надзеі ўскладаюцца на развіццё Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», будаўніцтва комплексу па вытворчасці амінакіслот у Пухавіцкім раёне.

> Усё, што мы робім, робім для людзей, каб яны дыхалі чыстым паветрам, ездзілі па добрых дарогах, каб іх лячылі і вучылі кваліфікаваныя ўрачы і педагогі. Галоўнае для нас, каб чалавеку жылося камфортна.

Не абышоў увагай Анатоль Ісачанка і такія значныя пытанні, як жыллёвыя; транспартнага, медыцынскага абслугоўвання; забеспячэння дзяцей дашкольнымі і школьнымі навучальнымі ўстановамі.

— На першага студзеня 2019 года ў Мінскай вобласці на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, стаяла больш за 85 тысяч сем'яў. З іх больш за 6 тысяч шматдзетныя, 32 тысячы маладыя сям'і. А таксама — больш як 6 тысяч дзяцей-сірот, — адзначыў губернатар. — У гэтым годзе плануем увесці ў эксплуатацыю 488 сацыяльных кватэр за кошт розных крыніц фінансавання. У планах забяспечыць таксама жыллём каля 3 тысяч шматдзетных сем'яў. Усе нашы абавязацельствы пацверджаны фінансава.

Толькі фізічна здаровае грамадства здольнае працаваць

ПРАДУКЦЫЯ,

sovrep.gov.by

даркі? Выконваючы абавязкі — гэта, лічы, дачаснік. Часовае знаходжанне ў якасці кіраўніка сельгаспрадпрыемства з'яўляецца станам нявызначанасці. Чалавек не разумее, у якім статусе ён знаходзіцца. Якіх вынікаў альбо рашучых крокаў з яго можна патрабаваць? Трэба яго альбо прызначаць, альбо шукаць новага чалавека, — заўважыў спікер верхняй палаты парламента.

Удзельнікі сесіі і выканкама падрабязна абмеркавалі стан спраў у прамысловасці. Адзначалася, што па выніках года забяспечаны рост аб'ёмаў вытворчасці ў трох з чатырох секцый прамысловасці. Але, нягледзячы на прынятыя меры па мадэрнізацыі і тэхнічным пераўзбраенні, вобласць не дасягнула запланаванага ўзроўню па інавацыйнай прадукцыі. Яе ўдзельная вага ў агульным аб'ёме склала 3,8 працэнта пры сярэднім рэспубліканскім — 18,6 працэнта. Інавацыйная дзейнасць названая прыярытэтам бягучай пяцігодкі, на гэтым кірунку павінна быць засяроджаная ўвага ўсіх гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, адзначаецца ў выніковым дакументе сумеснага пасяджэння.

Кожная вытворчасць сёння можа і павінна развіваць новыя кірункі дзейнасці, засяродзілі ўвагу на пасяджэнні. Размова ўзнікла вакол вытворчых паказчыкаў Жабінкаўскага цукровага завода, які адстае ад аналагічных вытворцаў з Мінскай, Гродзенскай абласцей па асартыменце, наменклатуры вырабаў. Сёння гэты рынак вельмі складаны. Апошняе звязана з ростам вытворчасці трысняговага цукру. «Таму трэба дыверсіфікаваць вытворчую дзейнасць і выпускаць прадукцыю, у аснове якой цукар, напрыклад кандытарскія дабаўкі. А не проста грузіць цукар мяхамі», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

> Сёння сярод партнёраў рэгіёна — 101 краіна, адкрыта дзесяць новых рынкаў збыту. Напрыклад, экспарт у Кітай павялічыўся ўдвая, гандаль з краінамі Еўрасаюза вырас на 15 працэнтаў.

Старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка выступіў перад дэпутатамі абласнога Савета са справаздачай.

і ствараць агульны дабрабыт, лічыць Анатоль Ісачанка. У малых населеных пунктах і аддаленых вёсках Міншчыны сталі паспяхова выкарыстоўваць перасоўныя медыцынскія дыягнастычныя комплексы. «Мы з асцярогай падыходзілі да новаўвядзення, папярэдне зрабілі маніторынг, апыталі каля 600 чалавек. Якасцю паслуг задаволены 98 працэнтаў жыхароў, 2 працэнты часткова. Негатыўных ацэнак не было. Такім чынам, аказанне гэтага віду меддапамогі з'яўляецца альтэрнатывай фельчарска-акушэрскім пунктам. Разам з тым стацыянарныя медустановы закрывацца не будуць», — запэўніў губернатар.

У вобласці рэалізуецца праект па стварэнні чатырох спецыялізаваных медыцынскіх цэнтраў: у Барысаве, Маладзечне, Салігорску і Мінскім раёне. Асаблівай увагі заслугоўвае апошні, дзе аказваць медыцынскія паслугі становіцца ўсё складаней, паколькі штогод насельніцтва прырастае на 7-8 тысяч. На ўзроўні ўрада і Міністэрства аховы здароўя прапрацоўваецца план умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы Мінскай раённай бальніцы. Ва ўсіх раёнах палепшылася забеспячэнне жыллём маладых спецыялістаў-медыкаў. У мінулым годзе пабудаваны 5-кватэрны жылы дом для ўрачоў Любанскай цэнтральнай раённай бальніцы. Сёлета плануецца завяршыць будаўніцтва трох інтэрнатаў для медыкаў прысталічча.

Самая цяжкавырашальная праблема — бадай, недахоп месцаў у дзіцячых дашкольных установах. Толькі ў Мінскім раёне, каб зняць напружанне, неабходна пабудаваць 16 дзіцячых садоў. «Пытанняў шмат, але мы разумеем, куды рухацца. Усё, што мы робім, робім для людзей, каб яны дыхалі чыстым паветрам, ездзілі па добрых дарогах, каб іх лячылі і вучылі кваліфікаваныя ўрачы і педагогі. Галоўнае для нас, каб чалавеку жылося камфортна. На гэта нацэльваем і кіраўніцтва раёнаў», — рэзюмаваў Анатоль Ісачанка.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ТЭМА ТЫДНЯ

БУДАЎНІКІ, КІРОЎЦЫ, РАБОЧЫЯ НА ЗАВОДЗЕ

Дзе шукаюць заробкі працоўныя мігранты?

У мінулым годзе выраслa колькасць беларусаў, што працавалі за мяжой. Прычым у агенцтвах па пошуку работы заўважаюць: усё часцей вакансіі ў іншых краінах цікавяць жыхароў вёсак і малых гарадоў. У гастарбайтары запісваюцца і людзі з прыгранічных рэгіёнаў. На гэта ёсць некалькі прычын. Кожны трэці з раёнаў, што трапілі ў спіс тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы, — прыгранічны. А значыць, тут ёсць беспрацоўныя, якія ў пошуку вакансіі больш за 12 месяцаў, спецыялісты, пераведзеныя на рэжым няпоўнай занятасці, арганізацыі, якія прастойваюць. Дый заробкі часта невысокія. Напрыклад, у Лёзне, дзе цяпер адкрыта 68 вакансій, 66 % прапаноў — 400 рублёў і ніжэй.

Геаграфія — ад Расіі да Амерыкі

Па афіцыйных даных МУС, летась працаваць у іншыя краіны выехала больш за 11 тысяч беларусаў (для параўнання: у 2016 годзе гэта лічба была больш сціплая — 7,4 тысячы). Найбольш папулярныя кірункі — Расія (туды адправілася амаль 45 % працоўных мігрантаў), Польшча (29 %) і Літва (каля 12 %). У пяцёрку ўваходзяць таксама Чэхія, ЗША і Германія. Сярод краін, куды яшчэ працаўладкоўваліся беларусы, — Фінляндыя, Кітай, Катар, Карэя, Малдова і іншыя.

У асноўным на заробкі едуць мужчыны — іх 67 % ад агульнай колькасці тых, хто выехаў па запрашэнні наймальніка. Пераважная большасць працоўных мігрантаў (83 %) уладкоўваецца на рабочыя спецыяльнасці. Кожны дзясяты знаходзіць вакансію ў сферы абслугоўвання і гандлю, кожны дваццаты — у сельскай гаспадарцы. На пасады кваліфікаваных спецыялістаў выехалі 154 чалавекі, а ў якасці кіраўнікоў — усяго дзевяць.

Неафіцыйныя лічбы беларусаў, што працуюць за мяжой, куды большыя. Бо, каб адправіцца на будоўлю ў тую ж Расію, не трэба ні візы, ні запрашэння. Па ацэнках Інстытута сацыялогіі пры Акадэміі навук Беларусі, работу ў іншых краінах шукаюць 8—10 % нашых грамадзян.

Чым прывабная Польшча?

Апошнія гады папулярнай для работы краінай стала Польшча. **Кіраўнік праграмы «Ла Страда Беларусь» Алена НЕСЦЯРУК** заўважае, што большасць зваротаў, якія паступаюць да іх на гарачую лінію, датычацца менавіта гэтай дзяржавы. Чаму? Наша заходняя суседка значна павысіла сваю міграцыйную прыцягальнасць для беларусаў, бо істотна спрасцілася заканадаўства ў сферы працаўладкавання.

Па статыстыцы Міністэрства сям'і, працы і сацыяльнай палітыкі Польшчы, за першае паўгоддзе 2018-га ў гэтай краіне было ўладкавана 38,9 тысячы беларусаў. Большасць (амаль 80 %) прыехала па спрошчанай сістэме — на падставе запрашэння на работу. Перыяд занятасці ў Польшчы складае ад трох да шасці месяцаў.

Калі казаць пра ўзрост, то на заробкі на Захад у асноўным адпраўляецца моладзь 25—34 гадоў (такіх амаль 40 % ад агульнай колькасці мігрантаў).

Што да сфер дзейнасці, то самая папулярная — будаўніцтва: амаль 37 % тых, хто з'язджае ў Польшчу, уладкоўваюцца туды. Яшчэ 25 % заняты ў галіне транспарту і лагістыкі, і 24 % — у прамысловасці. Частыя спецыяльнасці, па якіх працуюць нашы грамадзяне, — прамысловыя рабочыя і рамеснікі, рознарабочыя, аператары, мантажнікі машын і абсталявання. Ёсць, вядома, і офісны персанал, і праграмісты, і ўрачы, і педагогі, і менеджары найвышэйшага звяна, але яны сустракаюцца значна радзей.

Колькі зарабляе муляр

На якія ўмовы пагаджаюцца працоўныя мігранты? У адным з гродзенскіх агенцтваў, дзе дапамагаюць знайсці работу за мяжой, прызнаюцца: залатыя горы не абяцаюць. Кандыдатам без ведання мовы і запатрабаванай спецыяльнасці (а такіх большасць) прапануюць вакансіі на складах, заводах, мэблевых вытворчасцях — напрыклад збіраць дэталі, выконваць нескладаныя тэхнічныя аперацыі. Каб уладкавацца на прэстыжную пасаду ў банк ці медклініку, неабходна будзе не толькі веданне мовы, але і дыплом еўрапейскага ўзору.

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

Паводле статыстыкі, колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных за апошнія тры гады скарацілася ў тры разы: з 35,3 тысячы чалавек у 2016-м да 12,5 тысячы ў 2018-м. А ўзровень беспрацоўя зменшыўся з 0,8 да 0,3 %.

Найбольшая доля грамадзян без работы летась была зафіксавана ў Расонскім, Пастаўскім, Ваўкавыскім раёнах і горадзе Пінску. Але былі і рэгіёны, дзе ўзровень афіцыйнага беспрацоўя — усяго сотыя долі працэнта. І гэта не сталіца. Радзей за ўсё ў службы занятасці звярталіся ў Камянецкім і Быхаўскім раёнах.

Фактычнае ж беспрацоўе ў мінулым годзе склала 4,7 %. Самая напружаная сітуацыя назіралася на Магілёўшчыне — там гэты паказчык раўняўся 6,9 %. Традыцыйна тых, хто застаўся без работы, сярод мужчын больш, чым сярод жанчын: 5,9 % супраць 3,4 %.

— У асноўным беларусы патрэбны за мяжой у якасці рабочай сілы — на будоўлі, зборы ўраджаю, для абслугоўвання ў кавярнях і гасцініцах, — пацвярджае і **дырэктар першай юрыдычнай кансультацыі Гомеля Андрэй БАБІЧ.**

Чаму нашы грамадзяне сталі часцей выбіраць заходні кірунак, ён тлумачыць розніцай у заробках: калі ў Польшчы прапануюць тысячу еўра ў месяц, то ў Расіі ледзь не ў два разы менш. «Наймальнікам браць мігрантаў выгадна, бо, напрыклад, муляру-паляку за тую ж работу давялося б плаціць у два разы больш, 2000 еўра», — дадае Андрэй Бабіч. І прагназуе, што новым цэнтрам прыцягнення гастарбайтараў, магчыма, стане Казахстан.

Суразмоўнік заўважае, што апошнім часам на заробкі за мяжу часцей сталі выпраўляцца жыхары райцэнтраў і аграгарадкоў. І ахвотных з'ехаць стала больш: толькі да іх фірмы штомесяц звяртаецца 100—150 чалавек.

Скаргі на затрымку заробкаў

За мінулы год на інфалінію па бяспечным выездзе за мяжу праграмы «Ла Страда Беларусь» паступіла амаль 5,5 тысячы зваротаў. Колькасць тых, каму спатрэбілася крызісная дапамога, выросла ўдвая. Калі ў 2017-м спецыялісты праграмы дапамаглі 144 грамадзянам, што аказаліся ў складанай сітуацыі, то ў 2018-м — 287.

Асноўны прырост крызісных зваротаў звязаны з парушэннем працоўных правоў.

— За апошнія чатыры гады доля такіх зваротаў павялічылася ў паўтара раза, і сёння яна складае 43 працэнты ад усіх складаных сітуацый, па якіх тэлефануюць і пішуць нам беларусы, што выехалі за мяжу, — агучвае лічбу Алена Несцярук. На думку эксперта, часцей на інфалінію сталі звяртацца і таму, што зразумелі: трэба адстойваць свае правы. — Найбольшую колькасць праблемных званкоў дае Польшча. Па тэматыцы парушэння працоўных правоў 55 працэнтаў абанентаў звярталіся менавіта ў сувязі з непрыемнасцямі ў гэтай краіне. Асноўная скарга — нявыплата заробку.

Чакаць, што грошы вернуць за тыдзень ці за два, не варта. Калі гэта адносна добрасумленны наймальнік і ён не хоча нажыць праблем, то стараецца разабрацца з пытаннем — пераводзіць суму, якую завінаваціўся, на картку, прыязджае ў Беларусь і аддае грошы. Але ёсць справы, якія цягнуцца ўжо год.

— Залежыць ад таго, які дакумент пры ўладкаванні на работу быў падпісаны. Калі працоўны дагавор, то ў справу ўступае працоўная інспекцыя і працэс можа пайсці хутчэй. Па ўсіх астатніх дагаворах трэба звяртацца ў суд, — дзеліцца эксперт.

Летась пры ўдзеле супрацоўнікаў «Ла Страда» 15 % выпадкаў, звязаных з парушэннем працоўных правоў у Польшчы, былі вырашаны станоўча — людзям выплацілі заробак. 83 % зваротаў яшчэ разглядаюцца. У 2 % выпадкаў не ўдалося вярнуць работнікам грошы з-за недастатковай доказнай базы.

— Для паспяховага вырашэння праблемы патрабуецца шмат сіл і цярпення, — падкрэслівае кіраўнік праграмы. — Напрыклад, неабходна скласці тэкст скаргі, перакласці дакумент на польскую мову, сабраць доказы, што пацвярджаюць факт працаўладкавання і парушэння вашых правоў. Больш эфектыўна для пацярпелага асабіста звяртацца ў кампетэнтныя органы — інспекцыю па працы, пракуратуру. Электронны ці паштовы зварот будзе разгледжаны, але камунікацыя можа зацягнуцца, як і прыняцце самога рашэння па справе.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ДАЕШ БОЛЬШ ПРАЦЫ!

У прыгранічнай з Расіяй Віцебскай вобласці летась адкрылі 85 новых вытворчых прадпрыемстваў і 12 вытворчасцяў на ўжо існуючых. Сярэдняя зарплата па ўсіх прамысловых арганізацыях склала 954,2 рубля.

Паводле інфармацыі камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама, з ліку навічкоў больш за палову (56 %) займаюцца перапрацоўкай драўніны. Іншыя — шыццём адзення і абутку, перапрацоўкай мяса, вытворчасцю металічных вырабаў, правадоў і кабеляў, хлеба і кандытарскай прадукцыі, ветэрынарных прэпаратаў.

Новыя прамысловыя прадпрыемствы створаны ва ўсіх раёнах, акрамя Докшыцкага, Ушацкага, Мёрскага. У апошнім, дарэчы, і на функцыянуючых не стварылі дадатковыя вытворчасці.

А вось што датычыцца новых рабочых месцаў у прамысловасці, то ў 2018-м іх стварылі 863. І найбольшая колькасць у Віцебску (237) і Пастаўскім раёне (172).

Сёлета ў Прыдзвінскім краі запланавана стварыць 71 новае прамысловае прадпрыемства. Але, на думку кіраўніцтва абласной выканаўчай улады, гэтага недастаткова. На нядаўнім пасяджэнні, дзе абмяркоўвалі леташнія вынікі дзейнасці прамысловасці і планы, старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў крытыкаваў кіраўніцтва адстаючых раёнаў.

А спікер ніжняй палаты парламента Уладзімір Андрэйчанка параіў аўтсайдарам з'ездзіць у іншыя вобласці, каб павучыцца прыцягваць інвестыцыі і ствараць новыя рабочыя месцы. Тым больш што Віцебшчына — адзіная ў краіне летась не выканала план па прыцягненні прамых замежных інвестыцый. Не радуе і тое, што ў 2018-м тут стала на 13 % больш стратных прамысловых прадпрыемстваў. Ды і паказчык у рэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці падае. Летась уклад поўначы краіны ў гэтым кірунку — 15,1 %. Для параўнання: у 2010-м ён складаў 17,5 %.

А менавіта новыя высокаэфектыўныя вытворчасці і адпаведныя часу рабочыя месцы ў ліку іншага могуць кардынальна выправіць праблемную сітуацыю.

Як нагадаў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, актыўны ўдзел у стварэнні новых вытворчасцяў — задача прадстаўнічых органаў мясцовай улады.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЫНАК ПРАЦЫ

ХТО РАЗРУЛІЦЬ СІТУАЦЫЮ?

У Гродзенскай вобласці на аднаго кіроўцу прыпадае 10 вакансій

ГЭТА самая запатрабаваная на сённяшні дзень спецыяльнасць. Кіроўцы патрэбны ўсюды — у аўтапарках, кампаніях па перавозцы грузаў, нават за мяжой менавіта такі спецыяліст хутчэй за іншых знойдзе працу. Калі ў мінулым месяцы ў рэгіёне патрабавалася 500 чалавек па гэтай спецыяльнасці, то на пачатак сакавіка — ужо 540. Тэндэнцыя хоць і не катастрафічная, але патрабуе ўвагі. У такіх умовах многае залежыць ад наймальнікаў. Чым яны могуць прывабіць кіроўцаў, попыт на якіх, можна сказаць, зашкальвае.

Арэнда жылля

У Гродзенскім аўтобусным парку становішчам з кадрамі занепакоены. Горад прырастае новымі мікрараёнамі, што цягне за сабой і новыя маршруты. А кіроўцаў не хапае, паведамілі ў аддзеле кадраў. Напрыклад, на сярэдзіну сакавіка ёсць каля 20 вакансій. На летні сезон прагназуецца іх рост.

— У рабоце нямала стрэсавых сітуацый з пасажырамі, якія не хочуць аплачваць праезд, — адзначыла спецыяліст па рабоце з кадрамі, — ды і парк стары: каля 70 працэнтаў аўтобусаў адпрацавалі свой тэрмін амартызацыі. Не ўсюды ёсць кандыцыянеры, а чалавек хоча працаваць у камфортных умовах.

Між тым праблема аўтапарка не застаецца па-за ўвагай гарадскіх улад. Напрыклад, сёлета плануецца набыць 10 аўтобусаў. Вырашаецца і кадравае пытанне. У рамках праграмы перасялення прыцягваюцца кіроўцы з іншых населеных пунктаў. Яны забяспечваюцца арэндным жыллём на льготных умовах. І такой магчымасцю скарысталіся 14 чалавек. У аўтапарку шукаюць шляхі павялічэння зарплаты, зараз яна дасягае ў сярэднім адной тысячы рублёў.

Фінансавы бок

Попыт на кіроўцаў выкліканы і развіццём транспартна-лагістычнага сектара эканомікі. З'яўляецца ўсё больш кампаній, якія займаюцца грузавымі перавозкамі. Многія спецыялісты менавіта тут шукаюць больш высокія заробкі. Напрыклад, летась з аўтапарка ў дальнабойшчыкі сышлі 60 чалавек. І спыніць гэты працэс пакуль не атрымліваецца.

Дарэчы, ідуць на дальнія рэйсы не толькі прафесіяналы. Некаторыя перавучваюцца, маючы нядрэнныя спецыяльнасці. Не так даўно даведалася, што былы калега, прафесійны рэжысёр з абласной тэлерадыёкампаніі, звольніўся і пайшоў у дальнабойшчыкі. Здзівілася — як так? Столькі гадоў працаваў, дасканала ведае сваю справу, ды і работа цікавая, якая дае шырокае поле для творчасці. Але фінансавы бок аказаўся больш важкі. Да таго ж вакансій тут хоць адбаўляй.

Дастаткова зайсці ў інтэрнэт, каб упэўніцца ў попыце на такіх спецыялістаў на рынку працы. Ёсць прапанова для кіроўцаў, у тым ліку міжнароднікаў. І такая сітуацыя распаўсюджаная, расказаў прадпрымальнік з Гродна Генадзь Сямчук. Яго кампанія мае невялікі парк грузавых аўтамабіляў і некалькі гадоў займаецца перавозкай грузаў па Еўропе і Расіі. У яго заўсёды ёсць вакантныя месцы для кіроўцаў.

Але і прапаноў хапае, адзначае Генадзь. Менавіта на такіх маршрутах можна нядрэнна зарабіць. За месяц — ад тысячы еўра і вышэй. Разам з тым да саіскальнікаў ёсць і патрабаванні. Генадзь не бярэ на работу, калі бачыць, што чалавек часта мяняе працу, напрыклад раз на паўгода. Улічвае, вядома, і стан здароўя, узрост. Дарэчы, перавага аддаецца больш сталым кіроўцам. Па яго словах, у Польшчы, куды часта едуць працаваць беларусы, больш шанцаў у тых, каму ад 40 да 65 гадоў.

Рынак працы за мяжой

Прыгранічны рэгіён, безумоўна, адчувае канкурэнцыю на рынку працы з боку суседзяў. Часцей за ўсё жыхары Гродзеншчыны, у тым ліку і кіроўцы, едуць працаваць у суседнюю Польшчу. У інтэрнэце нямала сайтаў, на якіх перавозчыкі прапануюць работу ў гэтай краіне, прычым тэрмінова і з высокай аплатай. І ўсё ж многія, па словах Генадзя Семчука, вяртаюцца па сямейных абставінах. Многія, але далёка не ўсе. І працэс працоўнай міграцыі толькі пашыраецца. Праўда, тэмпы яго крыху запаволіліся.

Начальнік упраўлення дзяржаўнай службы занятасці камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр СОБАЛЬ прыводзіць такія лічбы. Летась праз агенцтвы выехалі на працу за мяжу 1600 чалавек, што на 300 больш, чым на год раней. Перад гэтым быў скачок працоўнай міграцыі ў два разы. Пераважная большасць накіроўваецца ў Польшчу.

Зразумела, што маштабы міграцыі значна большыя, бо многія шукаюць працу самастойна. Напрыклад, па выбарачным абследаванні асабістых гаспадарак, колькасць працоўных мігрантаў дасягае 10 тысяч.

Як запоўніць вакансіі

Напрыклад, кіроўцаў. У рэгіёне патрэба ў іх толькі расце. Калі на пачатак лютага было 500 вакансій, то на пачатак сакавіка — 540. Колькасць вакансій у 10 разоў перавышае колькасць беспрацоўных кіроўцаў. Але праблема яшчэ і ў самой асобе саіскальніка. Напрыклад, у аўтапарк не возьмуць чалавека, які быў пазбаўлены праў ці меў парушэнні правілаў дарожнай бяспекі. Затое тут бясплатна праводзяць курсы для атрымання адпаведнай катэгорыі. Летась такой магчымасцю скарысталіся 45 чалавек. Садзейнічае ў пошуку кіроўцаў і служба занятасці. Паступова гэтую прафесію асвойваюць жанчыны. У аўтапарку такія прыклады ёсць. Магчыма, гэты працэс набудзе большы размах. Як вядома, жанчыны пачалі кіраваць і буйнагабарытнымі фурамі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

17 апреля 2019 г. **ИЗВЕЩЕНИЕ** **№ 3-С/2019**

о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	ул. Джураева (район водонасосной станции)	340100000005007534	0,1000	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Зона санитарной охраны водопроводных сооружений	37 340,00	1 000,00	2 378,42
2	ул. Камышовая (в районе жилого дома № 20)	340100000006005540	0,0984		Охранная зона электрических сетей, сетей и сооружений канализации	28 280,16	1 000,00	2 504,78
3	ул. Проселочная, 12	340100000004001499	0,1439		Охранная зона электрических сетей	18 980,41	500,00	4 132,83

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий, необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. №3-6, 3-14).
3. **Аукцион состоится 17 апреля 2019 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы:
4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования, при необходимости нотариально удостоверенную доверенность;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.4 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность, и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
*6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукцина за земельный участок **для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома возмещает затраты на проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной ифраструктуры к земельному участку** (не распространяется на граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий). Величина затрат определяется администрацией района г. Гомеля по месту нахождения земельного участка при выдаче разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома.*
7. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
8. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 18 марта по 15 апреля 2019 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14. Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.00 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115**

Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

Тэлесеткі

ВА ЎСІМ БАЧЫЦЬ ПЛЮСЫ

Здавалася б, што можа быць больш банальным — і разам з тым больш запатрабаваным, — чым прагноз надвор'я на тэлебачанні? Большасць гледачоў перакананая, што вядуць прагноз надвор'я самыя прыгожыя дзяўчаты, таму рэйтынгі ў яго заўжды даволі высокія. Стваральнікі новай праграмы «Плюс-мінус. Надвор'е на тыдзень», што выходзіць на тэлеканале «РТР-Беларусь» кожную суботу, разлічваюць, што іх праект не стане выключэннем.

За 13 хвілін вядучая Ірына Смольская паспявае не толькі расказаць метэанавіны, удакладніць у сіноптыкаў прагноз па Беларусі і зверыць прыкметы народнага календара з рэальнасцю, але і даць карысныя парады, напрыклад аўтааматарам або людзям, схільным да прастуды, прапанаваць увазе гледачоў дайджэст адметных кліматычных здарэнняў на планеце і падборку забаўных сюжэтаў, звязаных з вядучымі прагнозу надвор'я.

«Апошнія некалькі гадоў я больш працавала ў інфармацыйным жанры, а цяпер мне вельмі падабаецца спрабаваць сябе ў новым амплуа, якое мне бліжэйшае па настроі, — расказала «Звяздзе» Ірына Смольская. — Дый сам фармат праграмы вельмі зручны: 13 хвілін — не многа і не мала, паспяваеш расказаць усё самае цікавае пра клімат і не стаміць гледача». Калі ж надвор'е зусім не радуе, вядучая раіць знаходзіць плюсы ў іншых рэчах: «Я і сама не люблю дождж і холад і вельмі чакаю прыходу сапраўднай вясны, цёплых сонечных дзён, бо нам, на жаль, у Беларусі ўсё ж не хапае сонца. Але ў любых кліматычных умовах важна захоўваць пазітыў унутры — хадзіць у басейн, строіць планы

на лета, сустракацца з сябрамі, займацца любімымі справамі... А прагноз надвор'я, дзякуючы шчыльнаму супрацоўніцтву з Белгідраметам, мы вам прапануем самы свежы і максімальна дакладны!»

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота перададзена тэлеканалам.

КАНДЫДАТ у майстры спорту Аляксандр Кур'ян стаў пераможцам чэмпіянату Мінскай вобласці па рускіх шашках сярод мужчын з парушэннем зроку. Цікава, што троху раней ён перамог у такіх жа спаборніцтвах, але па шахматах. На другім месцы Міхаіл Лесун, на трэцім — Уладзімір Сапацько. У жаночым турніры перамагла Марыя Лесун, другой фінішавала Жанна Захарэвіч. Трэцяе месца ў Веранікі Слюсарэнкі.

З 18 па 24 лютага ў СДЮШАР па шахматах і шашках г. Мінска праходзіла першынство Беларусі па шашках-64 сярод моладзі, у якім прынялі ўдзел 139 спартсменаў з усіх абласцей краіны. Чэмпіёнамі ў сваіх узростах сталі Інга Барашка (Д11, Гомель), Іван Бародзіч (Ю11, Мінск), Дар'я Нікіфарава (Д14, Мінск), Марат Леў (Ю14, Слонім), Вікторыя Нікалаева (Д17, Мінск), Захар Шыбакоў (Ю17, Мар'іна Горка), Яна Якубовіч (Д20, Мінск), Міхаіл Семянюк (Ю20, Мінск), Вера Хвашчынская (Д27, Бабруйск), Уладзіслаў Валюк (Ю27, Мінск).

Паглядзіце цікавы прыклад гульні.

№ 19 А. Курьян — К. Набокаў

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 84

Белыя простыя шашкі: c1, c3, d2, f4, h2 (5).
Чорныя простыя шашкі: a5, b4, c5, f6, h8 (5).

Белыя згулялі 1.hg3 і ў далейшым перамаглі. Прапануем нашым чытачам прааналізаваць магчымасць ахвяры 1.fe5 і вызначыць вынік гульні.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя майстрам спорту па шашачнай кампазіцыі Дзмітрыем Камчыцкім (Магілёў). Па ўласным прызнанні Дзмітрыя, на складанне дадзеных кампазіцый яго натхніў прагляд матэрыялаў шашачнага аддзела нашай газеты.

№ 20

№ 20
Белыя простыя шашкі: a3, a5, c1, d2, g5, h4, h6 (7).
Чорныя простыя шашкі: b4, c3, c5, d6, d8, e5, f2, f8 (8).

№ 21
Белыя простыя шашкі: a1, a5, b2, b6, e5, f4, g5 (7).
Чорныя простыя шашкі: a3, c7, d2, d6, d8, e7, f2, g7 (8).

№ 22
Белыя простыя шашкі: c1, c5, e1, e3, g3, g7 (6).
Чорныя простыя шашкі: a7, b6, e5, f8, h2, h6 (6).

Зацікавіўся нашымі матэрыяламі і майстар шашачнай кампазіцыі Генадзь Андрэеў з Латвіі і прапануе свае варыяцыі ў шашкі-100 на раней апублікаваныя кампазіцыі.

№ 23
Белыя простыя шашкі: 12, 16, 17, 21, 32, 34, 40, 44, 49 (9).
Чорныя простыя шашкі: 2, 10, 13, 20, 23, 26, 29, 33, 35 (9).

№ 24
Белыя простыя шашкі: 28, 30, 32, 33, 34, 40, 49 (7).
— Адказнасць у праекце ўзаемная. Наша задача — даць якаснае насенне і дапамагчы рэалізаваць вырашчаны прадукт. А вам трэба сачыць за ростам культур і выконваць рэкамендацыі агранома і ментараў, якія будуць падказваць, як і што рабіць, — кажа Рыма Епур, звяртаючыся да ўдзельніц.

— Праект «Прадпрымальная землеўласніца» вельмі актуальны ў плане самазанятасці сельскага насельніцтва і развіцця ў яго эканамічнай актыўнасці, — упэўнены **Аляксандр ТРУХАН, дырэктар беларускага дзіцячага фонду, аднаго з арганізатараў праекта.** — Для фонду праект важны тым, што матывуе жанчын, якія выхоўваюць дзяцей, ці апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі і часова не ўдзельнічаюць у эканоміцы, на больш актыўнае і прадпрымальнае выкарыстанне свайго часу, рэсурсаў і зямлі.

Самазанятасць і супольная кааперацыя

Мяркуецца, што разам з жыхарамі Зубрэвічаў да праекта далучацца ахвотныя і з суседніх вёсак. Абсталяванне для працы на зямлі і з агароднінай арганізатары мяркуюць акумуляваць у цэнтры падтрымкі прадпрымальніцтва (бізнес-інкубатары) у горадзе Барань, што ў Аршанскім раёне. Тут прафесіяналы будуць абрабляць вырашчаныя культуры і пры неабходнасці вакуумаваць іх. Цэх па перапрацоўцы агародніны, які з'явіцца дзесьці на скрыжаванні паміж Зубрэвічамі, Вусцем і Забалаццем, на думку арганізатараў, павінен стаць неад'емнай часткай рэалізацыі праекта.

Толькі кааперацыя з аднадумцамі дасць перавагі і падчас вырошчвання якаснага ўраджаю, і пры яго рэалізацыі. З гэтай думкай прафесіяналаў згодны і **Андрэй КІРНЕЎ, старшыня Зубрэвіцкага сельсавета**, які заклікае сяльчан браць у карыстанне пустыя землі на вёсцы. Цяпер такіх у Зубрэвічах да дзясятка ўчасткаў па 15—20 сотак.

Аформіць зямлю для працы на ёй можна рознымі шляхамі, аднак найбольш просты — узяць яе ў арэнду на тры гады (у часовае карыстанне). На сям'ю даецца тры гектары. І гэтага больш чым дастаткова, каб папрактыкавацца.

— Мы ўсё жыццё саджаем, але ніхто яшчэ ад гэтага не разбагацеў, — кажа адзін з прысутных.

— Таму, што так, як прапануюць, ніхто ніколі гэтым не займаўся, — пераконвае старшыня. — Зямля будзе цаніцца, проста не ўсе гэта разумеюць. Яна заўжды карміла людзей. Мы ўсе ад яе жывём.

— Той, хто дома мае агарод, нічога не прайграе, — упэўнены **Тарас ЯРОМІН, які працуе ў школе настаўнікам працоўнага навучання** і мае 50 сотак зямлі. — Я і сябе пракармлю, і лішкі прадам. Мне не цяжка і сабе зарабіць, і суседзям дапамагчы. А прадукцыі будзе больш.

Узрушаныя сяльчане пачынаюць абмяркоўваць, колькі трэба будзе заплаціць за апрацоўку зямлі, арэнду тэхнікі, колькі вады спатрэбіцца для паліву ды іншыя практычныя моманты. Так што па ўсім відаць, што праект, разлічаны на жанчын, якім будуць дапамагаць мужчыны, рухаецца ў правільным кірунку.

Ірына СІДАРОК.

Светлогорский районный исполнительный комитет проводит открытый аукцион на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания магазина

Аукцион состоится в 11.00 15 апреля 2019 года в зале заседаний райисполкома по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1.

Назначение участка: земельный участок для строительства и обслуживания магазина (1 16 03 земельный участок для размещения объектов розничной торговли).

Кадастровый номер земельного участка: № 325050100002005379, площадь – 0,1029 га, расположен по адресу: Гомельская область, Светлогорский район, г. Светлогорск, микрорайон Полесье, район жилых домов № 23 и № 24, срок аренды – 10 лет.

Характеристика расположенных на участке строений, инженерных коммуникаций: имеются ограничения (обременения) в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (охранная зона линий связи и радиофикации (площадь 0,0134 га), сетей и сооружений теплоснабжения (площадь 0,0167 га).

Условия продажи права аренды: победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении этого участка;

2. Заключить со Светлогорским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию создания земельного участка и возникновение прав, ограничений на земельный участок;

3. Получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года;

4. Приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;

5. Снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно строительному проекту;

6. Осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

7. По миновании надобности, но не 2 месяцев до окончания срока договора аренды, возвратить земельный участок, предоставленный в аренду, Светлогорскому райисполкому в состоянии, пригодном для использования в прежних видах земель или продлить в установленном порядке срок пользования им

Начальная цена права заключения договора аренды – 5340 руб. 26 коп.

Сумма задатка: 1050 руб.

К участию в аукционе допускается: гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо, подавшее заявление на участие в аукционе и заключившее соглашение со Светлогорским райисполкомом, с приложением следующих документов:

документ, подтверждающий внесение задатка, с отметкой банка. Задаток перечислятся на расчетный счет № BY27AKBB36044290020443200000 в ЦБУ № 322 филиала № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21312, УНП 400019707, Светлогорский райисполком; назначение платежа – задаток на аукцион;

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность, документ, удостоверяющий личность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Документы для участия в торгах принимаются по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, каб. 31, с 8.30 до 17.30 по рабочим дням с даты опубликования извещения до 11 апреля 2019 г. включительно. Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 11.00 по адресу: г. Светлогорск, пл. Центральная, д. 1, каб. 34. Телефоны: 8 (02342) 90839, 53066.

Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников, при наличии одного участника предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667»

Просим считать объявление страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест», вышедшее в номере 28880 от 22.01.2019, недействительным в части полиса серии BY07 № 16345221.

УНП 100357923

Страховые полисы карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 15186292, 15186381, 16346220; полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА № 1474416 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной в связи с утерей.**

УНП 100357923

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует об изменении начальной цены предмета аукциона (лот № 3 – **холодильник** (здание специализированное иного назначения) с инв. № 401/С-11450, принадлежащего Филиалу «Гродненское зверохозяйство» торгового унитарного предприятия «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза»), назначенного на **17.04.2019 в 11.00.** Ранее указанная цена изменена на: **199 200,00** бел. руб. (с НДС 20 %). **Контактная информация: тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. www.cpo.by E-mail: auction@cpo.by** УНП 191021390

ГЛЫБІНКА

ЦАНА ДОЎГАГА РУБЛЯ

Некалькі гісторый з жыцця працоўных мігрантаў

Калі вёска знаходзіцца на 50-кіламетровай адлегласці ад абласнога цэнтра ці сталіцы, то ў яе жыхароў праблем з работай быць не павінна. Не знойдзецца месца ў сельскай гаспадарцы (што з развіццём тэхнікі натуральная справа) — можна скокнуць у электрычку ці маршрутку і паехаць у горад, дзе рабочыя рукі заўсёды патрэбны. Але хапае ў нас і такіх вёсак, ад якіх да мегаполісаў дабірацца паўдня. У найбліжэйшым ад іх райцэнтры — адзіны завод, і той не надта добра сябе адчувае. Тады выйсце — ехаць за мяжу. «МС» прыгледзелася да адной з такіх вёсак на Палессі.

НА ЎСХОД...

Алег падаўся на Маскву адразу пасля службы ў арміі: «Усе ехалі, і я паехаў». Разам з аднакласнікамі ўладкаваўся на будоўлю маналітных шматпавярховікаў. Тое, што работа была нелегальнай, хлопца зусім не палохала.

— Калі малады, думаеш у першую чаргу пра грошы, якімі перад тваім носам памахалі, а не пра бяспеку, бальнічныя і аплатны адпачынак, — расказвае Алег. — У лепшыя часы я мог зарабіць 1000—1500 долараў у месяц. Маім бацькам такія сумы толькі сніліся, а мяне яны падштурхоўвалі працаваць больш.

Разуменне сур'ёзнасці прыйшло да маладога чалавека ўпершыню толькі тады, калі адзін з сяброў сарваўся з рыштаванняў і загінуў. Увогуле, у родную вёску з маскоўскіх будоўляў за апошнія гадоў сем прыйшло ўжо тры труны. Ні выплат, ні нават спачувальных лістоў сем'ям загінулых ніхто не даслаў. «Нелегалы ведаюць, на што ідуць», — разводзяць рукамі нядобрасумленныя работадаўцы, але закон на іх баку.

Рызыка для жыцця — не адзіная праблема. Гастарбайтарам прыходзіцца «ўкалваць» так, быццам жывуць яны ў дарэвалюцыйныя часы і 40-гадзінны працоўны тыдзень яшчэ не прыдумалі. Зацемна пачалі, зацемна скончылі. Пад дажджом і снегам, у вецер і маразы. Цярпі, калі прыехаў.

— Жывём мы звычайна ў вагончыках ці інтэрнатах, якія дае наймаючая кампанія. Умовы, мякка кажучы, на трохзоркавы гатэль не цягнуць. Бывала, па 12 чалавек у адным пакоі тулілася.

Яшчэ гады тры таму ўсё гэта было варта цярпець дзеля добрай зарплаты. Зараз сумы атрымліваюцца значна меншыя, таму многія з таварышаў Алега перасталі ездзіць у Маскву і аселі на мінскіх будоўлях. Чаму ж ён не спяшаецца вярнуцца на радзіму?

— Я прызвычаіўся, куды цяпер рыпацца? Фактычна, толькі там і працаваў, — кажа хлопец.

А вось сваяк Алега — Антон — са змяншэннем зарплаты шчыраваць на старых умовах адмовіўся. У вёсцы ў яго сям'я. Пакуль ён матаўся па расійскіх будоўлях і толькі набегамі з'яўляўся дома, яго старэйшы сын падрос і пайшоў у першы клас. Нарадзілася дачушка. На заробленыя грошы пара прыдбала неблагое аўто, купіла дом (старэнькі, але ўжо пачалі рабіць рамонт). Цяпер Антон увогуле нікуды не ездзіць. Цяжкая праца на знос дала аб сабе знаць — забалела спіна. Але без справы дома не сядзіць, пачаў як прыватнік рабіць рамонты. Не так выматвае, але, як высветлілася, і на гэтым можна капейку зарабіць.

...І НА ЗАХАД

Дваццацівасьмігадовага Максіма на перон прыйшлі праводзіць жонка Маша і двухгадовы сын Сашка. Хударлявы галава сям'і з замілаваннем глядзеў на малога і ні на імгненне не адпускаў далонь каханай. Напярадзе яго чакала паўтара месяца без сям'і і доўгая-доўгая дарога. Спачатку на Варшаву, а адтуль — куды шэф скажа. Максім працуе дальнабойшчыкам.

— Калі шчыра, то няма ніякай розніцы, дзе баранку круціць. Беларусь, Еўропа, Азія... Абы толькі грошы плацілі. Хочацца, каб і ў сына ўсё было, і каб жонка ні ў чым патрэбы не мела, — дзеліцца хлопец. — Важна, што я афармлены афіцыйна.

Сапраўды, у Польшчу беларусы едуць працаваць у асноўным легальна. Але для гэтага з самага пачатку трэба грошы ўкласці: на візу і іншыя дакументы, дарогу, пражыванне першым часам. Да таго ж паехаць можна толькі загадзя атрымаўшы запрашэнне ад работадаўца. Як яго знайсці? Праз агенцтвы, якім таксама прыйдзецца выдаткаваць пэўную суму. Але нават пры гэтым ёсць верагоднасць застацца падманутым.

На адным з папулярных беларускіх форумаў людзі якраз дзеляцца гісторыямі пра тое, як іх «кідалі» з работай за мяжой.

«Хацеў уладкавацца маляром-пескаструменьшчыкам у Гданьск, — піша адзін. — Абяцалі 17—19 злотых у гадзіну і ў месяц 280—300 рабочых гадзін. Адразу папярэдзілі, што за пражыванне прыйдзецца плаціць 500 злотых, за ежу — 300—400. Аднак калі прыехаў, чакаў сюрпрыз: каб адпрацаваць 280 гадзін, трэба быць у добрых стасунках з майстрам. А паколькі калектыў быў інтэрнацыянальны, то перавагу ён аддаваў землякам. Плюс «камфартабельнае жыллё» аказалася пакойчыкам на восем чалавек з двухпавярховымі ложкамі. Пры такім раскладзе на рукі я атрымліваў каля 600 долараў... Для Беларусі грошы неблагія, але для Еўропы гэтага мала. У выніку на такіх умовах я доўга не працягнуў і вярнуўся ў Сінявокую».

Апошнія некалькі гадоў у маленькіх гарадах і вёсках на дошках з аб'явамі ўсё часцей з'яўляюцца нумары з тэлефонамі агенцтваў, якія дапамагаюць працаўладкавацца ў Польшчы. Аднойчы мне нават давялося пазнаёміцца з такім «памагатым». Мы ехалі ў адной маршрутцы, а дарога, як вядома, схіляе да доўгіх і шчырых размоў. Мужчына бесперапынна расказваў пра тое, як ужо некалькі гадоў запар возіць беларусаў на заробкі да заходніх суседзяў.

— Ні работы нармальнай, ні перспектыў у нашай вёсцы не відаць, — заявіў ён, чым адразу ж прыцягнуў увагу ўсіх пасажыраў. — А пара, якой я дапамагаў некалькі гадоў таму з дакументамі, кардынальна змяніла сваё жыццё. Працуюць на заводзе, жывуць у невялікім мястэчку на прыграніччы. Вучаць мову, нават грошы адкладваюць. Тут бы ў іх што было? Праца ў калгасе, яшчэ б і сваю гаспадарку трымаць прыйшлося. А там еўрапейскі ўзровень! Я, дарэчы, і сваю маці прымусіў спачатку карову прадаць, а летась і апошняга кабанчыка забілі. Дужа плакала тады, праўда. І цяпер раз-пораз папракае. Сіл у яе яшчэ хапае, але навошта вазіцца з гэтым гноем, калі ўсё можна купіць у краме?

Я слухала разважанні мужчыны моўчкі. А ў галаве круціліся думкі і пра моладзь, якая працуе на чужыне, і пра бедную маці-пенсіянерку. Можа, для яе тыя кароўка з кабанчыкам былі адзіным заняткам, акрамя прагляду тэлевізара? Вясковы чалавек, калі яго пасадзіць у хаце — ён жа памрэ. Натура такая: жывы, пакуль у зямлі капаецца і скацінку даглядае. Але ці зразумее гэта той, хто зарабляе на вывазе рабочай сілы за мяжу? Хто сам ніколі не ўкалваў ні тут, ні там?..

ЖАНОЧЫ ПОГЛЯД

Большасць мужчын, якія працуюць за мяжой, настроеныя на вяртанне дадому. Там — дзеці, жонкі, бацькі. Нават тыя, хто пакуль не паспеў стварыць сям'ю, імкнуцца пабудаваць уласны дом ці набыць кватэру менавіта там, адкуль прыехалі. А вось дзяўчаты, якія адважваюцца на пошукі лепшага за мяжой, глядзяць на сітуацыю пад іншым вуглом.

Тоня па адукацыі настаўніца хіміі. Папрацаваўшы некалькі гадоў па спецыяльнасці, дзяўчына зразумела, што дома ёй «нічога не свеціць» у асабістым плане. Калі змірыцца з нізкай зарплатай яшчэ можна, то з адсутнасцю сям'і — не. Вось дзяўчына і падалася ўслед за мужыкамі са сваёй вёскі ў Расію. Уладкавалася ў падмаскоўную касметычную краму прадаўцом, зняла жыллё, а праз некаторы час і жаніха знайшла. Там жыць і засталася.

А што жанчыны, якія чакаюць у вёсках сваіх мужоў? Іх доля незайздросная. Самі гадуюць дзяцей, самі ўпраўляюцца з хатняй гаспадаркай. «Маскоўскія пакіданкі» — так іх аднойчы назваў мой знаёмы і падкрэсліў, што шкадаваць жанчын не трэба. Маўляў, гэта толькі спачатку яны сумуюць па сваіх мужыках, а на другі-трэці год адзіноты не-не ды пачынаюць паглядваць у «левы бок». Колькі сямей распалася, а колькі знаходзіцца ў стане перманентнага разладу з-за адносін на адлегласці, ніхто дакладна не скажа.

— Пляменнік мой такі харошы хлопец. Не п'е, не курыць, грошы з Расіі прывозіць, хату сваю адбудаваў. І чаго гэтай паве толькі не хапала? — расказвае пяцідзесяцігадовая Вольга. — Прыехаў Вадзік аднойчы дамоў, а там ні жонкі, ні дзяцей. Адна запіска: «Не магу цярпець адзіноту. Прабач».

* * *

Нельга сказаць, што працоўная міграцыя беларусаў — праява выключна нашага часу. Мой прапрадзед Васіль Сацкевіч у пачатку XX стагоддзя разам з аднавяскоўцамі ездзіў на заробкі ў Амерыку. На якіх умовах і пры якіх абставінах яны вырашылі адправіцца на іншы канец свету, у сям'і ніхто ніколі не казаў. Ведаю толькі, што ў вёсцы ён быў на добрым рахунку, бо з жывёлай умеў абыходзіцца і лічыўся там кімсьці накшталт ветэрынара. Затое часта ўспаміналі дома пра шлях, які прыйшлося пераадолець дзеду. Уявіце сабе: мужык не тое, што па-англійску, нават па-руску ці беларуску пісаць і чытаць не ўмеў, але праехаў неяк усю Еўропу і перасёк акіян. Пасля жыў некалькі гадоў у культуры абсалютна адрознай ад нашай. І што самае цікавае, цэлым і здаровым вярнуўся дадому.

Ганна ВОЛЯНСКАЯ.

УЛАСНЫ БІЗНЕС НА ПАМЕЖЖЫ

Як зарабіць на мухах і манетызаваць сваё захапленне?

Вышыты крыжыкам мядзведзік у рамцы 10х15 — больш за 20 гадоў таму з яго пачалася мара аб сваёй справе Веранікі ШЧУРОЎСКАЙ. Сёння сярод вырабаў прадпрымальніцы ручнікі, этнасумкі, хрысцільныя наборы і нават паліто. Прадукцыя майстрыхі карыстаецца попытам не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Ажыццявіць мару аб сваім бізнесе Вераніка і яшчэ восем прадпрымальнікаў са Смаргонскага раёна змаглі дзякуючы праекту «Развіццё сельскіх тэрыторый у Рэспубліцы Беларусь». Ініцыятыву рэалізуюць грамадскія аб'яднанні «Экапартнёрства» і «Жанчыны за адраджэнне Нарачанскага краю».

ПЕРСПЕКТЫВЫ РЭГІЁНА

Каб абмеркаваць вынікі рэалізацыі праекта на Смаргоншчыне, арганізатары сумесна з Саветам па развіцці прадпрымальніцтва мясцовага райвыканкама правялі круглы стол. «Прадпрымальніцкая ініцыятыва павінна стаць асновай для далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі», — упэўнена **намеснік старшыні Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта Таццяна ШЧАБЯРАКА.**

У раёне сёння працуюць больш за 1500 прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу. Рознічным гандлем займаюцца амаль 35 % прадпрымальнікаў, сфера паслуг валодае 24 %, грузаперавозкі — 15 %, вытворчасць — 14 %.

Па словах Таццяны Шчабяракі, існуюць шэсць крытэрыяў, якія характарызуюць узровень малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (МСП) у рэгіёне. Першы і асноўны — колькасць суб'ектаў МСП на 1000 занятых у эканоміцы. На Смаргоншчыне за апошнія тры гады сітуацыя стабільная — гэты паказчык 21,8 суб'екта. У малым і сярэднім прадпрымальніцтве працуе 5460 чалавек (25 % ад агульнай колькасці занятых у эканоміцы).

ПАРТНЁРСТВА ДЗЕЛЯ РАЗВІЦЦЯ

Суарганізатар круглага стала — аб'яднанне «Экапартнёрства». Асноўны вектар яго дзейнасці — экалагічныя праблемы краіны, адзін з кірункаў працы — устойлівае развіццё, таму «Экапартнёрства» сумесна з арганізацыяй «Жанчыны за адраджэнне Нарачанскага краю» сталі рэалізоўваць праект «Развіццё сельскіх тэрыторый у Рэспубліцы Беларусь: павышэнне ролі сельскага прадпрымальніцтва шляхам стварэння і запуска ў Камарове сельскага бізнес-інкубатара».

Праект распрацаваны дзеля развіцця сельскай мясцовасці шляхам падтрымкі прыватных ініцыятыў.

«Наш праект працуе ўжо прыблізна два гады. Мэтавымі групамі з'яўляюцца малыя і сярэднія прадпрыемствы ў зоне рэалізацыі праекта, эксперты, асобы, якія прымаюць рашэнне, грамадскія аб'яднанні, бізнес-арганізацыі. Мы працуем у чатырох раёнах — гэта паўночна-заходняя частка Рэспублікі Беларусь», — расказвае **выканаўчы дырэктар «Экапартнёрства» Аліна БУШМОВІЧ.**

Удзельнікамі праекта сталі Мядзельскі, Смаргонскі, Пастаўскі і Астравецкі раёны. Яны з'яўляюцца ўнікальнай сельскай тэрыторыяй, што знаходзіцца побач з мяжой Еўрапейскага саюза і аддалена ад буйных прамысловых цэнтраў. Менавіта развіццё малога і сярэдняга прыватнага бізнесу можа стаць крыніцай стварэння новых рабочых месцаў.

> Быў час, калі ўсе хацелі быць юрыстамі, эканамістамі, зараз усе айцішнікамі жадаюць быць. Як выйсці з гэтай сітуацыі, каб не «задушыць» сельскую мясцовасць?

Праект складаецца з трох этапаў, якія ўжо практычна рэалізаваны. Першы — запуск бізнес-інкубатара ў вёсцы Камарова Мядзельскага раёна, другі — стварэнне школы сельскага бізнесу, і апошні — падтрымка мясцовых ініцыятыў, якія былі адабраныя для фінансавання.

Круглы стол праводзіўся таксама ў рамках падрыхтоўкі «белых кніг».

— Гэта такія даследчыя справаздачы, якія робяцца для апісання вопыту, што атрымалі прадпрымальнікі-пачаткоўцы ў рамках праекта. Яны неабходныя, каб расказаць іншым у нашай краіне і, магчыма, за яе межамі, якія ёсць у нас станоўчыя моманты і перашкоды, — паведаміла Аліна Бушмовіч. — А таксама там будуць рэкамендацыі па развіцці сельскага прадпрымальніцтва.

РУЧНІКІ І ЛІЧЫНКІ ЯК БІЗНЕС-ІДЭІ

У рамках праекта адбылося пяць цыклаў школы сельскага бізнесу. Ахвотныя адкрыць сваю справу вучыліся і распрацоўвалі бізнес-планы. Камісія экспертаў падчас мерапрыемства «Стартап Уікэнд» шукала ідэі для фінансавання. Усяго было адабрана 24 ініцыятывы, 9 з іх рэалізуюцца зараз на Смаргоншчыне. На якім этапе знаходзяцца бізнес-ідэі, удзельнікі круглага стала пачулі першымі.

Гісторыі многіх новых прадпрымальнікаў пачыналіся з таго, што хтосьці вярнуўся на малую радзіму з горада або змяніў жыццё ў сталіцы на вясковую цішыню.

Сярод прадпрымальніцкіх ідэй і сельскагаспадарчыя (вырошчванне клубніц, вытворчасць біягумусу), і прамысловыя (стварэнне драўляных вокнаў). Напрыклад, **Аляксей СВІРСКІ** за грантавыя грошы закупляе абсталяванне і аднаўляе памяшканне для рамонту машын, а **Іван МАЦЮК** з сям'ёй уладкоўвае на аграсядзібе «Паланэз» музей-трапезную для правядзення свят і прыёму экскурсійных груп. Увогуле, многія з удзельнікаў праектаў падзяляюць думку, што бізнес павінен быць сямейным.

Пра тое, як справу для душы ператварыць у бізнес, расказала **Вераніка ШЧУРОЎСКАЯ**: «Сутнасць маёй ідэі — вырабы па індывідуальным заказе. Рабіла акцэнт на слове «індывідуальныя». Я сёння не гатова пускаць сваю працу на паток — не магу я рабіць 20 аднолькавых сумак ці ручнікоў».

Спачатку майстрыха планавала рабіць толькі хрысцільныя наборы. Успамінае, што перад тым, як стала хроснай маці, не змагла знайсці жаданы выраб. Зараз Вераніка плануе наборы для царкоўнага абраду дэкларацыяваць, каб

была магчымасць прадаваць іх у магазіне.

«Людзі гатовыя плаціць за эксклюзіў», — сцвярджае жанчына і прыводзіць прыклад, як кліент з Калінінграда аплаціў ёй дарогу, каб яна прывезла выраб.

Дрэнны той салдат, што не марыць стаць генералам. А бізнесмен дрэнны той, які не жадае абысці сваіх канкурэнтаў. Як гэта зрабіць, **Ілья АГАРКАЎ** ужо ведае. Яго ініцыятыва — перапрацоўка адходаў птушкафабрык у жывыя лічынкі мух, высушаныя і заагумус — будзе ў суткі даваць да 500 літраў сыравіны. У канкурэнтаў аб'ёмы сціплейшыя — 460 літраў.

«Біямаса можа прадавацца рыбакам у жывым выглядзе, можа сушыцца і быць кормам для сельскагаспадарчых жывёл, рыбы», — расказвае аб рынках збыту прадукцыі прадпрымальнік.

ПАДТРЫМКА ІНІЦЫЯТЫВЫ ЭКСПЕРТНАЯ

Рэалізаваць свае ідэі ў канкрэтныя прадпрыемствы многія з удзельнікаў школы бізнесу змаглі дзякуючы вучэбна-практычнай установе «БіКамарова». Цэнтр пастаяння аказвае кансультацыйную падтрымку ініцыятывам з чатырох раёнаў, якія ўдзельнічаюць у праекце.

«Праблема развіцця прадпрымальніцтва ў нашай краіне — гэта не столькі заканадаўчая база, не столькі адсутнасць фінансавых сродкаў, а адсутнасць разумення, як гэта рабіць, — канстатуе **Эдуард ВАЙЦЯХОВІЧ, дырэктар «БіКамарова».** — Быў час, калі ўсе хацелі быць юрыстамі, эканамістамі, зараз усе айцішнікамі жадаюць быць. Як выйсці з гэтай сітуацыі, каб не «задушыць» сельскую мясцовасць? Мы тады прыдумалі дыверсіфікацыю сельскай эканомікі, што, акрамя сельскай гаспадаркі, існуюць разнастайныя віды — перапрацоўка, прамысловасць, фінансы, турызм і іншыя віды бізнесу».

Па словах Эдуарда Вайцяховіча, асноўны рэсурс Беларусі — чалавечы. «Эканоміка трымаецца на актыўных, працаздольных людзях, якія хочуць і могуць працаваць. Ім трэба дапамагаць», — падкрэслівае дырэктар бізнес-інкубатара.

Створаны ў Смаргоні свой цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва «БізнесАрыенцір», які аказвае разнастайныя (арганізацыйныя, інфармацыйныя, бухгалтарскія) меры падтрымкі невялікіх прадпрыемстваў.

...І ДЗЯРЖАЎНАЯ

Па-першае, асаблівыя ўмовы для бізнесу ў вёсцы існуюць у падатковай сферы. Мерамі Указа № 345 на Смаргоншчыне на пачатак года скарысталіся 16 суб'ектаў прадпрымальніцтва. Пра прэферэнцыі пры аказанні рознічнага гандлю і паслуг на вёсцы расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення кантрольнай работы інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Смаргонскім раёне Аляксей ВАЛОХІН.** Для індывідуальных прадпрымальнікаў гэта выплата адзінага падатку ў памеры базавай велічыні ў месяц. Для ІП, якія выкарыстоўваюць агульную сістэму падаткаабкладання, устаноўлена паніжаная стаўка падаходнага падатку ў 6 %.

«Што датычыцца арганізацый, ім устаноўлены льготы па падатку на дабаўленую вартасць. Гэта значыць, што арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць на вёсцы, не з'яўляюцца плацельшчыкамі падатку на дабаўленую вартасць у частцы аказання гэтых паслуг», — сказаў Аляксей Валохін. Таксама выкарыстоўваецца паніжаная стаўка па падатку на прыбытак.

> Удзельнікамі праекта сталі Мядзельскі, Смаргонскі, Пастаўскі і Астравецкі раёны. Яны з'яўляюцца ўнікальнай сельскай тэрыторыяй, што знаходзіцца побач з мяжой Еўрапейскага саюза і аддалена ад буйных прамысловых цэнтраў. Менавіта развіццё малога і сярэдняга прыватнага бізнесу можа стаць крыніцай стварэння новых рабочых месцаў.

«Арганізацыя прадпрымальніцкай дзейнасці стала добрай альтэрнатывай традыцыйным формам занятасці насельніцтва, асабліва ў сельскай мясцовасці і малых гарадах», — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама Тамара РАМАНОВІЧ.**

Спецыяліст расказала ўдзельнікам круглага стала, як можна атрымаць бязвыплатную субсідыю для адкрыцця бізнесу. «Субсідыя даецца на аснове заявы і тэхніка-эканамічнага, у тым ліку фінансавага абгрунтавання, бізнес-плана, эфектыўнасці арганізаванай прадпрымальніцкай дзейнасці. Перавагу беспрацоўныя найбольш часта аддаюць дзейнасці ў сферы паслуг: пашыў і рамонт адзення, рамонт бытавых вырабаў, аўтамабіляў, вытворчасць і рамонт мэблі», — прывяла прыклад Тамара Рамановіч.

Каб выдалі субсідыю, трэба знайсці і свабодную нішу, справа павінна быць запатрабавана ў рэгіёне. Субсідыя складае 11-кратную велічыню бюджэту пражыткавага мінімуму (з 1.02.2019 года — 2386 беларускіх рублёў). Калі сваю справу вырашае адкрыць беспрацоўны, зарэгістраваны ў малым горадзе ці раёне з высокай напружанасцю на рынку працы або ў вёсцы, то сума павялічваецца да 3254 беларускіх рублёў.

Сумесны круглы стол раённых органаў улады і грамадскага аб'яднання «Экапартнёрства» стаў пляцоўкай, дзе прадпрымальнікі змаглі не толькі пракансультавацца са спецыялістамі, але і атрымаць адказы на свае пытанні да ўлады. І ў бізнесе, і ў дзяржаўным будаўніцтве можна рухацца наперад толькі слухаючы, дапамагаючы і стараючыся зразумець адно аднаго.

Марыя ДАДАЛКА.

г. Смаргонь.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29

Предмет аукциона

Лот № 1. Квартира 2, общ. пл. **74,3 кв. м**, инв. № **500/D-70591**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-2.** Начальная цена без НДС – **231 800,00 бел. руб.**

Лот № 2. Квартира 12, общ. пл. **67,8 кв. м,** инв. № **500/D-70611**, по адресу: **г. Минск, ул. Карла Маркса, 33-12.** Начальная цена без НДС – **212 800,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия по Лотам №№1–2. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **20** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) – обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

При приобретении Лота № 1 победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: водомер ((счетчик горячей воды), инв. № 61692577) – 72,30 бел. руб. с НДС 20 %, водомер ((счетчик холодной воды), инв. № 61692576) – 72,38 бел. руб. с НДС 20 %, кухонная плитка CEZARIS ПГ 2100-01(инв. № 61692982) – 142,94 бел. руб. с НДС 20 %.
При приобретении Лота № 2, победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи следующего имущества: счетчики учета воды (инв. № 60004411) – 24,76 бел. руб. с НДС 20 %, счетчики учета воды (инв. № 60004412) – 24,76 бел. руб. с НДС 20 %, кухонная плитка CEZARIS ПГ 2100-01 (инв. № 61692983) – 142,94 бел. руб. с НДС 20 %

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**01.04.2019** в 15.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**28.03.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24

Предмет аукциона
Месторасположение: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, д. Вязанка, 1Б

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер
Магазин	84,8 кв. м	600/С-143737

Составные части и принадлежности: сарай, крыльцо

Сведения о земельном участке: пл. **0,1011** га, предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 19.11.2043) для обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона, охранная зона ЛЭП напряжением свыше 10 кВ, пл. 0,0402 га

Начальная цена лота с НДС 20 % – 79 000,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Аукцион состоится 22.04.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 18.04.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

І ВЫ АСУДЖАНЫ НА ПОСПЕХ...

З чаго пачынаюцца добрыя справы? З ідэі? З людзей, гатовых аб'яднаць вакол сябе іншых? З выдзеленых грошай? Яно, безумоўна, так. Але часам не хапае маленькага штуршка. І конкурс «TANDEM IV — Устойлівае супрацоўніцтва паміж НДА і мясцовымі органамі ўлады дзеля актывізацыі ўдзелу грамадзян у мясцовым самакіраванні і развіцця мясцовых супольнасцей у Рэспубліцы Беларусь» дапамог рэалізаваць у розных кутках нашай краіны шэраг шыкоўных праектаў. Стары закінуты парк у Дуброўне ператварыўся ў зону адпачынку, быў добраўпарадкаваны пляж у Кармянскім раёне, узяты пад ахову ўнікальны дэндрапарк у Краснаполлі, на Гродзеншчыне з'явілася экасцежка для людзей з парушэннямі зроку, у гарпасёлку Мачулішчы актывісты ўзяліся за ахову рэдкіх птушак і раслін, у Ашмянах дзейнічае цудоўны музей Дугі Струвэ, у Кобрынскім раёне вясковыя жыхары зараз могуць з камфортам чакаць прыезду аўтакрам: з'явіліся навесы і лавачкі, у розных кутках Беларусі былі абсталяваны пляцоўкі для дзяцей і заняткаў спортам.

Усяго на конкурс было пададзена 160 заявак, з іх адабраны і прафінансаваны адзінаццаць міні-праектаў, якія прайшлі рэгістрацыю ў Дэпартаменце гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Часта даводзілася чуць, што нашым грамадзянам нічога не патрэбна. З іншага боку, працуючы на месцах у рэгіёнах, мы сутыкаліся з даволі нядрэнным узроўнем грамадзянскай актыўнасці. Супярэчнасць? Мы хацелі разабрацца, хто правы. І для гэтага была задумана спецыяльная праграма, каб матываваць грамадзян, спрыяць развіццю ўзаемадзеяння паміж мясцовымі органамі ўлады і арганізацыямі, — заўважыў падчас выніковай канферэнцыі **старшыня праўлення асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі» Міраслаў КОБАСА.** — Нядаўна праведзенае апытанне паказала, што каля 65 працэнтаў грамадзян на пытанне «На каго вы спадзеяцеся ў вырашэнні мясцовых праблем?» адказалі, што на саміх сябе. Яны гатовы ўключыцца ў грамадска карысную працу. Калі вы трапіце ў іх надзённыя праблемы, знойдзеце людзей, здольных арганізаваць вакол сябе іншых, вы асуджаны на поспех.

Так, гэта адна з абавязковых умоў, якая ставіцца перад канкурсантамі, — ствараць праекты, якія будуць здольныя ўцягваць мясцовых жыхароў. Фінансаванне (а дадзеная праграма рэалізуецца пры падтрымцы Еўрапейскай асацыяцыі мясцовай дэмакратыі — ALDA) можна атрымаць пад будматэрыялы ці тыя ж трэнажоры для спартыўнай або дзіцячай пляцоўкі, а паслугі (напрыклад, будаўнічыя работы) — гэта ўжо непасрэдны ўнёсак людзей, якія жывуць у пэўнай мясцовасці. І аказалася, што людзі сёння гатовы прыкласці намаганні для таго, каб зрабіць свой край больш утульным і прыгожым. Часам на будаўнічыя пляцоўкі выходзілі сем'ямі. Людзі прыносілі свае інструменты, забяспечвалі доступ да электраэнергіі і вады, капалі, будавалі, фарбавалі, вялі зварачныя работы, саджалі расліны. Часта праекты, якія пачыналіся з добраўпарадкавання тэрыторый, «абраставалі» іншымі добрымі справамі. Падключаліся ўстановы культуры, ладзіліся канцэрты, святы, адукацыйныя праграмы для дзяцей.

TANDEM IV засведчыў, што можна шмат зрабіць, калі брацца за справу разам. І не толькі таму, што мясцовыя жыхары гатовы працаваць як валанцёры — бескарысліва. Часам, калі ў пэўным горадзе ці вёсцы актыўна распачыналіся работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, нечакана знаходзіліся новыя рэсурсы — падключаўся бізнес, прадпрыемствы за свой кошт дапамагалі з тэхнікай і будматэрыяламі.

Але самае галоўнае — нараджаўся дыялог, у выніку з'яўляліся новыя тандэмы. Мясцовыя органы ўлады і грамадскія арганізацыі, якія навучыліся працаваць разам, сёння рыхтуюць новыя партнёрскія праекты.

— Большасць праектаў, якія рэалізоўваліся падчас «ТАНДЭМа» — сацыяльнага кірунку, але і такія тэмы, як культура, устойлівае развіццё, здаровы лад жыцця, праекты для дзяцей і моладзі, таксама падтрымліваюцца ў межах праграмы. Што павінны ўлічваць канкурсанты, якія падрыхтуюць праекты для TANDEM V? — пацікавілася «МС» у Міраслава Кобасы.

— Кожная ідэя абавязкова павінна захапіць людзей, каб яны самі стваралі тое, што палепшыць іх жыццё, свет навакол. Па-другое, пасля завяршэння праекта павінна застацца нешта матэрыяльнае.

— А ці можна звярнуцца ў Фонд імя Льва Сапегі па ідэі? Усё ж падчас чатырох «ТАНДЭМаў» было падтрымана амаль паўсотні міні-праектаў, зроблена шмат карыснай працы.

— У межах розных праграм фонду нашага аб'яднання на мясцовым узроўні было рэалізавана 99 праектаў. Мы выдалі кнігу, дзе ў сціснутым выглядзе выкладзена інфармацыя пра наш досвед і якраз ёсць багата ідэй для магчымых праектаў.

Напрыклад, вельмі цікавы вопыт уяўляе праект «КУТ» (культура кіравання тэрыторыяй), рэалізаваны ў Ашмянскім раёне, які было б добра распаўсюдзіць па ўсёй краіне. У гэтага праекта вельмі добрая матрыца, там аб'яднана шмат важных кампанентаў: інтарэсы і мясцовых органаў улады, і прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, і грамадзян, развіццё валанцёрскага руху.

Падобныя праекты трэба толькі вітаць, а напаўняць змест кожнага з іх павінны актуальныя пытанні мясцовага жыцця. Падчас рэалізацыі сваіх праектаў удзельнікі «ТАНДЭМаў» рэгулярна сустракаюцца на агульных семінарах, канферэнцыях, круглых сталах, у навучальных паездках. Абмен досведам паміж імі не толькі павялічвае паспяховасць будучых праектаў, але і вядзе да з'яўлення новых яскравых ідэй на будучыню.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 14 сакавіка 2019 года.